

ШАНЦ ПЕРААДОЛЕЦЬ НАРКАЗАЛЕЖНАСЦЬ 7

ДЗЕ ПРАХОДЗІЎ «ПЯТЫ ФРОНТ»? 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 146 (30280)

## ЛІЧБА ДНЯ



**126 763**

*замежнікі з Еўрасаюза скарысталіся бязвізавым уездам у Беларусь з 1 студзеня 2024 года. Усяго з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму ў Беларусь уехалі 927 369 замежнікаў. З моманту ўвядзення пашыранага бязвіза (з 19 ліпеня) Беларусь наведалі 7219 жыхароў Еўропы. Акрамя грамадзян Польшчы, Літвы, Латвіі (а таксама неграмадзян Латвіі) у нашу краіну ў бязвізавым парадку прыбылі 455 прадстаўнікоў еўрапейскіх краін, а гэта 6 % ад агульнага патоку. Большасць з іх з Германіі і Эстоніі — 181 і 111 іншаземцаў адпаведна, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце.*

з першых вуснаў

# «ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ВЫЗНАЧЫЦЬ СТРАТЭГІЮ РУХУ ДА МЭТ, ЯКІЯ МЫ АКРЭСЛІЛІ»

«Турызму» быць не павінна, якасць і вынік — прыярытэт. Падрабязнасці нарады па міжнародных пытаннях

**Новы працоўны тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся са знешняй палітыкі. Кіраўнік дзяржавы правёў нараду па міжнародных пытаннях. Нагод для гэтай нарады ў апошнія тыдні было нямала: Прэзідэнт з візітам наведаў Расійскую Федэрацыю, прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка — Лацінскую Амерыку, міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў — КНДР. Нашу краіну таксама наведала нямала замежных дэлегацый. Не спыняюць сумесную работу з замежнымі партнёрамі беларускія парламентарыі, прадпрыемствы, установы аховы здароўя і адукацыі і іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі. Таму тэм для канструктыўнай размовы дастаткова.**



Фота БелТА.

Як заўважыў беларускі лідар, міжнародны парадак дня застаецца вельмі напружаным. Графік міжнародных сустрэч даволі насычаны. Па яго словах, усё гэта патрабуе канцэнтрацыі ўвагі на будучых мерапрыемствах і на тых, што ўжо адбыліся. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі прымаюцца вельмі правільныя рашэнні па наладжванні адносін з рознымі краінамі. Візіты Прэзідэнта, урадавых дэлегацый у розныя рэгіёны малююць перспектывы, планы на будучыню. Але часта дамоўленасці не атрымліваюць практычнага ўвасаблення. І, як заўважыў Прэзідэнт, атрымліваюцца паўтурыстычныя паездкі.

«Давайце дамовімся, што роля Прэзідэнта, вобразна кажучы, — адкрыць акно ў тым ці іншым напрамку, стварыць фундамент для будучых дамоўленасцяў членаў урада і прэм'ер-міністра», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, рэалізоўваць усе дамоўленасці з замежнымі партнёрамі павінен найперш урад, дзе ў ролі вядучага міністэрства замежных спраў, пад кантролем Адміністрацыі Прэзідэнта. «Турыстычных паездак быць не павінна. Ніякага турызму. Павінен быць вынік», — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, на нарадзе трэба зверыць гадзіннікі і прадумаць крокі на найбліжэйшую перспектыву і па выкананні дасягнутых дамоўленасцяў па выніках візітаў у пэўныя краіны. Аляксандр Лукашэнка вылучыў найбольш важныя кірункі.

### Расія — усе пытанні вырашаны

«Я ўжо не ведаю, якія патрэбны фундаменты з майго боку, каб выбудоўваць дыхтоўны дом нашых адносін. І стратэгічныя пытанні вырашаны, і па асноўных кірунках прынятыя рашэнні, і тактычныя», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы паставілі, як звычайна бывае, не вырашаныя вамі з урадам Расіі пытанні (а павінны былі вырашыць) — па нафтаформуле (новай формуле цэнаўтварэння), другое пытанне — утылізацыйны збор і трэцяе пытанне — аб перадаплаце за нафту, — звярнуўся Прэзідэнт да ўдзельнікаў нарады. — Усе гэтыя пытанні мы абмеркавалі з Прэзідэнтам Пуціным. Больш за тое, мы дамовіліся аб тым, што я сёння-заўтра (у залежнасці ад таго, як вы гэта падрыхтуеце) накірую яму пісьмовае пасланне, ліст, з выкладаннем сутнасці гэтых трох пытанняў». Прэзідэнт расказаў, што ключавымі пытаннямі яго нядаўніх перагавораў з Уладзімірам Пуціным былі пытанні бяспекі, яны насілі закрыты характар. «Падключаць урад я не бачу сэнсу. Усе сілавыя структуры, міністэрства замежных спраў па пэўных пытаннях падключаны. Вось сутнасць гэтых перагавораў, — сказаў ён. — Але яшчэ раз падкрэслю: узаемаразуменне знойдзена па ўсіх пытаннях».

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка 30 ліпеня па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі здзейсніць рабочы візіт у Ісламскую Рэспубліку Іран для ўдзелу ў цырымоніі інаўгурацыі выбранага Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Масуда Пезешкіана.**
- Курганныя групы старажытнага насельніцтва Палесся выявілі ў нацыянальным парку «Прыпяцкі».
- **Самы высокі прахадны бал на бюджэт у БДМУ склаўся на стаматалагічным факультэце.**
- Аграрыі Баранавіцкага раёна першыя ў Брэсцкай вобласці намалацілі 100 тысяч тон зерня.
- **Мінсувязі выпускае ў абарачэнне шэсць паштовых марак з серыі «Грыбы-двайнікі».**

ISSN 1990 — 763X

24146>

Карысны вопыт

# У МСЦІСЛАВЕ БУДУЮЦЬ УСТОЙЛІВАЕ ЗАЎТРА

**У раёне паспяхова рэалізуюцца мэты ўстойлівага развіцця рэгіёна**




**Добрая экалогія, здаровае насельніцтва, квітнеючая эканоміка, наплыў турыстаў — гэта, па сутнасці, і ёсць тое, што хаваецца за сціплай абрэвіятурай МУР — мэты ўстойлівага развіцця. Каб ажыццявіць гэтыя планы на практыцы, краіны, гарады, раёны ствараюць адмысловую стратэгію. Такая была распрацаваная Мсціслаўскім раёнам у 2021 годзе. У адпаведнасці з ёй тут укараняюцца ў жыццё ініцыятывы з прыцэлам на будучыню. Наколькі актыўна ідзе гэты працэс, можна было даведацца падчас другога па ўліку рэгіянальнага фестывалю ўстойлівага развіцця «Разам за ўстойлівае заўтра». Форум быў прымеркаваны да 100-годдзя ўтварэння раёна.**

СТАР. 5

Фестывалім

# У абдымках вішнёвай каралевы

**Дванаццаты раз на Віцебшчыне прайшло міжнароднае свята «Вішнёвы фестываль», якое сабрала сотні гасцей і ўдзельнікаў з розных куткоў свету. Традыцыйна горад Глыбокае на два дні пераўтвараецца ў творчую прастору з адметным вішнёвым смакам.**



Фота ТК «Глыбоцкі раён. Афіцыйна».

Стартаваў фестываль 26 ліпеня з тэматычнай рэгістрацыі нараджэння маленькай глыбачанкі Ксеніі Рагавой, якая нарадзілася 11 ліпеня. Першы і галоўны дакумент дачкі маладыя бацькі Ігар і Анастасія атрымалі ў раённым аддзеле ЗАГС з удзелам ганаровых гасцей.

СТАР. 13

# «ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ВЫЗНАЧЫЦЬ СТРАТЭГІЮ РУХУ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што восенню, напярэдадні 25-годдзя Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, у Мінску адбудуцца ўсе важныя мерапрыемствы — і саюзны Саўмін, і Вышэйшы дзяржсавет. «З Прэзідэнтам Расіі мы дамовіліся, што да гэтага моманту павінны быць закрытыя ўсе праблемныя пытанні — і па лініі саўбезаў (аб гарантыях бяспекі), і па тэмах урада», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што пры вырашэнні пытанняў канкрэтных варта не забываць і пра перспектыўныя кірункі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння сітуацыя склалася такім чынам, што беларускія спецыялісты, працуючы з расійскімі калегамі, могуць разам з космасам, атамнай энергетыкай адкрыць для сябе новыя кампетэнцыі, вельмі важныя для нашай краіны. Па яго словах, задзелы ў гэтым кірунку, і ў авіябудаванні, і ў мікраэлектроніцы, і асабліва ў станкабудаванні ў нас ёсць. Прэзідэнт расказаў, што падчас наведвання Іркуцкага авіябудаўнічага завода асабіста пераканаўся, што ў Расіі ёсць інтарэс да беларускай тэхнікі, да нашых станкоў. Таму сёння беларускім вытворцам трэба хутка асвойваць новыя тэхналогіі і пастаянна ўдасканальваць сваю прадукцыю, зразумела, не забываючы пра яе якасць.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра яго дамоўленасці з Уладзімірам Пуціным, дасягнутыя падчас апошняга наведвання Мінска расійскім кіраўніком: Беларусь павінна быць незалежнай і самадастатковай краінай з устойлівай эканамічнай асновай. «Але не забывайцеся, з чым мы прыйдзем у гэты юбілей да нашых людзей. Што дае праект Саюзнай дзяржавы простаму беларусу і расіяніну? Што гэта ім дае?» — задаў ён рытарычнае і адначасова злабадзённае пытанне. Беларускі лідар падкрэсліў, што Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы трэба акунуць у праблемы паўсядзённых спраў. Ён нагадаў пра даручэнне на пляцоўцы Пасткама комплексна прааналізаваць усе аспекты забеспячэння роўных правоў грамадзян. «Зроблена нямала, але і праблем хапае, а мы чамусьці іх замоўчваем», — заўважыў Прэзідэнт.

## Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — адкрываюцца каласальныя перспектывы

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што нядаўна адбыўся саміт ШАС, дзе Беларусь выступіла ў новым статусе — члена гэтай арганізацыі. «Праведзены шэраг двухбаковых сустрэч. Добрыя былі сустрэчы. Дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці. Давайце іх рэалізоўваць. Міністр замежных спраў быў на кожнай сустрэчы. Трэба неадкладна вызначыць стратэгію руху да мэт, якія мы акрэслілі», — сказаў ён. У прыклад беларускі лідар прывёў Пакістан. Прэм'ер-міністр гэтай краіны Шахбаз Шарыф падчас сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам у Астане канкрэтна сказаў, што ім цікава і што трэба ў Беларусі. Акрамя таго, была дасягнута дамоўленасць аб візіце Прэзідэнта ў Пакістан. Але, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, да гэтага павінны быць поўныя напрацоўкі. «Трэба неадкладна вызначыць стратэгію рэалізацыі дамоўленасцяў. І рабіць гэта трэба па гарачых слядах», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што з уступленнем у ШАС перад Беларуссю адкрываюцца каласальныя перспектывы. Перш за ўсё — дадатковыя магчымасці доступу на вялізны рынак тавараў і паслуг, абмен вопытам, прыцягненне інвестыцый, і галоўнае — дыверсіфікацыя лагістыкі і разлікаў, зніжэнне палітычных рызык. «Усе беларускія ініцыятывы я абазначыў у Астане. Вы ўсё чулі», — нагадаў ён.

## БРІКС — яшчэ адна апора

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь запрошана на саміт БРІКС, які хутка пройдзе ў Казані. «Гэта сур'ёзная структура, якая аб'ядноўвае самыя магутныя дзяржавы нашай планеты. Яна ахоплівае больш за 40 працэнтаў насельніцтва Зямлі. І мы зацікаўлены ўключыцца ў інтэграцыйныя працэсы на дадзенай пляцоўцы. БРІКС — яшчэ адна апора, з дапамогай якой мы зможам захоўваць раўнавагу і эканамічную ўстойлівасць. МЗСу неабходна сфарміраваць план нашага ўдзелу на гэтай пляцоўцы і, у прыватнасці, маіх сустрэч без усялякага перабору», — сказаў ён. Прэзідэнт расказаў, што цяпер з боку Паўднёвай Афрыканскай Рэспублікі ёсць вялікая зацікаўленасць у супрацоўніцтве з Беларуссю. «Развітая, нябедная краіна, прасунутая краіна. І да таго, што мы маем у Экватарыяльнай Гвінеі, Нігерыі, на ўсходзе ў Кеніі, на поўдні — Зімбабвэ, Мазамбік, яшчэ і ў Паўднёвай Афрыканскай Рэспубліцы, дзе нас чакаюць. Не трэба нам расплывацца па ўсіх кантынентах. У нас не тая эканоміка, каб глабалізмам займацца. Трэба вызначыцца ў кожным пункце, чым мы будзем займацца, і зрабіць гэта», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ёсць ініцыятыва дэлегатаў УНС аб падрыхтоўцы ад імя Усебеларускага народнага сходу звароту аб міры і ўнясенні яго на разгляд у БРІКС. Ён даручыў адказным асобам вывучыць і прапрацаваць гэту ініцыятыву.

## Кітай — чакаецца візіт Прэм'ера Дзяржсавета

Акрамя таго, звярнуў увагу Прэзідэнт, заяўлены шэраг важных візітаў у Рэспубліку Беларусь. Зусім хутка Мінск наведае Прэм'ер Дзяржсавета Кітайскай Народнай Рэспублікі Лі Цян. Віцэ-прэм'ер Снапкоў далажыў аб выпрацоўцы перагаворнай пазіцыі ў развіццё дамоўленасцяў Прэзідэнта з Сі Цзіньпінам. «На перагаворах у Астане мы не чапалі канкрэтныя пытанні, акрэсліўшы іх. На што Сі Цзіньпін сказаў: «Не адштурхоўвайцеся толькі ад перагавораў са мной. Прыедзе прэм'ер — усе канкрэтныя пытанні ў яго кампетэнцыі». І мы павінны іх вырашыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт нагадаў, што нядаўна адбыўся шэраг важных візітаў — урадавай дэлегацыі ў Лацінскую Амерыку і міністра замежных спраў у КНДР. Ён пацікавіўся стратэгіяй выбудоўвання адносін з гэтымі краінамі. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што многія пытанні застаюцца на ўзроўні справаздач і размоў, а канкрэтныя пытанні не вырашаюцца. А міжнароднае супрацоўніцтва — найважнейшае пытанне эканомікі. Эфектыўнасць міжнароднага супрацоўніцтва ў таварнагандлёвай плоскасці напрамую залежыць ад якасці беларускай прадукцыі, якую мы прапаноўваем замежным партнёрам. На гэты аспект Прэзідэнт звярнуў пільную ўвагу ўсіх удзельнікаў нарады. Ён зрабіў акцэнт на тым, што да якасці беларускіх тавараў не павінна быць ніякіх пытанняў, ні на ўнутраным, ні на знешнім рынках.

## У тэму

**«Мы не кідаемся з боку ў бок»**

Падчас нарады **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** далажыў, што з 13 да 21 ліпеня ўрадавая дэлегацыя з візітам наведала Кубу, Венесуэлу і Нікарагуа. Па яго словах, гэтыя краіны разглядаюцца як істотны рэзерв для росту беларускага экспарту. «У сувязі з гэтым у маі ўрадам была зацверджана праграма дзеянняў па развіцці супрацоўніцтва з гэтымі краінамі, у адпаведнасці з якой замацаваны і даведзены да ўсіх нашых экспарцёраў канкрэтныя таварныя пазіцыі з аб'ёмамі паставак на працягу трох гадоў: 2024—2026. Лічбы браліся з улікам нашага папярэдняга досведу работы там і аналізу патрэб рынку. Таму, уласна кажучы, кожны ведае, што яму рабіць і якую задачу выканаць па кожнай наменклатуры», — далажыў прэм'ер-міністр.

У размове з журналістамі Раман Галоўчанка падкрэсліў: вялікае значэнне для Беларусі рынку Лацінскай Амерыкі звязана з яго вялікім патэнцыялам (насельніцтва больш за 600 мільёнаў чалавек) і прыродных запасаў карысных выкапняў, уключаючы нафту, літый, медзь, серабро. «Таму нам трэба паступова замацоўвацца, кожны год павялічваць нашу там прысутнасць», — падкрэсліў ён. «Мы не кідаемся з боку ў бок. Выбралі курс, па якім і рухаемся. Магчыма, дзесьці працэсы ідуць не так хутка, як нам хацелася б. Хтосьці прывык жыць больш спакойна і ставіцца больш спакойна да часавага фактару. У нас такой магчымасці няма. Нам трэба ўсё хутка. Таму расслабленасць нашых партнёраў будзем кампенсаваць нашай напорыстасцю, і ўрэшце выйдзе жаданы вынік», — сказаў Раман Галоўчанка.

Што датычыцца супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, то, па словах прэм'ер-міністра, цяпер тут няма вострых пытанняў, якія не вырашаюцца. Ідзе характэрны для краін з такімі цеснымі ўзаемасувязямі працэс выбудоўвання мадэляў супрацоўніцтва ў канкрэтных сферах. У гэтым працэсе так ці інакш узнікаюць некаторыя пытанні, у тым ліку якія патрабуюць дазволу на ўзроўні прэзідэнтаў. Гэта непазбежна, бо адносіны Беларусі і Расіі — жывая матэрыя. Да таго ж, яны развіваюцца вельмі бурна. Таму і прэзідэнты дзвюх краін сустракаюцца досыць часта.

Раман Галоўчанка расказаў, што мадэль супрацоўніцтва дзвюх краін выбудоўваецца наступным чынам: прэзідэнты абмеркавалі, далі даручэнні, абазначылі асноўныя падыходы, а затым урады і міністры кладуць на паперу дасягнутыя дамоўленасці. «Канструкцыі гэтыя заўсёды няпростыя. Яны завязаны на сур'ёзныя фінансавыя пытанні, узаемную фінансавую, вытворчую, лагістычную падтрымку. Гэта ўсё трэба пакласці на паперу», — растлумачыў ён. Тое ж самае адбылося і падчас перагавораў Уладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнкі на Валааме.

**«У аснове — эканамічная стратэгія»**

**Першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ** падкрэсліў, што візіт Прэм'ера Дзяржсавета КНР Лі Цяна ў Беларусь будзе гістарычны — першы за апошнія 17 гадоў. На парадку дня візіту будзе ўся канкрэтыка беларуска-кітайскіх адносін, найперш у гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах. «Мы ўпэўнены, што гэты візіт дасць магутны імпульс для кітайскага бізнесу па шырокім інвестыцыйным прыходзе ў Беларусь. У аснове будзе эканамічная стратэгія, якую вызначыла на апошнім пленуме Кітайская Народная Рэспубліка. Гэта новыя прадукцыйныя сілы, якія ўключаюць у сябе навуку, інавацыі, чалавечы капітал», — заявіў Мікалай Снапкоў. Ён расказаў, што ў рамках візіту таксама плануецца падпісаць дакумент аб аб'яўленні наступнага года ў супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Кітаем Годам навукі і інавацый.

**«Ёсць вялікі спектр кірункаў, дзе краіны маглі б адна адной дапамагчы»**

Сваімі ўражаннямі ад візіту ў Карэйскую Народна-Дэмакратычную Рэспубліку і вынікамі гэтага візіту з журналістамі падзяліўся **міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ**. «Краіна вельмі цікавая, — сказаў міністр. — Акуратная краіна, якая развіваецца. Пхеньян вельмі чысты добры горад. З пункту гледжання краіны для жыцця выглядае прыстойна і можа даць фору многім іншым краінам». Па словах Максіма Рыжанкова, у Паўночнай Карэі маюць патрэбу ў нашай прадукцыі. «Асабліва я хацеў бы вылучыць прадукцыю фармацэўтычнай прамысловасці. Для мяне было вялікім сюрпрызам убачыць у аптэцы польскія лекі і адсутнасць беларускіх, — расказаў ён. — Адпрацоўваліся пытанні паставак нашага харчавання — малочнай і мясной прадукцый. Іх цікавіла дзіцячае харчаванне». Таксама абмяркоўваліся пытанні аб супрацоўніцтве ў сферах аховы здароўя, адукацыі. Ужо дасягнута дамоўленасць, што беларускія спецыялісты наведаюць КНДР і абмяняюцца вопытам у выбудоўванні работы дашкольнай адукацыі. Максім Рыжанкоў падкрэсліў, што ў Беларусі і КНДР ёсць вялікі спектр кірункаў, дзе краіны маглі б адна другой дапамагчы.

Паколькі ў выбудоўванні адносін з ШАС Міністэрства замежных спраў адыгрывае асноўную ролю, кіраўнік ведамства расказаў, як ідзе работа ў гэтым кірунку. Па яго словах, хутка будзе прызначаны спецыяльны нацыянальны каардынатар, некалькі чалавек будуць назначаны ў Сакратарыят ШАС (аб гэтым дасягнута дамоўленасць) і ў антытэрарыстычны цэнтр. Максім Рыжанкоў заявіў, што Беларусь мае намер выбудаваць вельмі дакладнае ўзаемадзеянне ў плане работы па лініі ШАС. Найперш за кошт уцягвання міністэрстваў і ведамстваў у мерапрыемствы галіновага характару, якія праводзяцца пад эгідай арганізацыі. Па словах міністра, зараз парадак дня ў ШАС насычаны пытаннямі развіцця эканамічнага і фінансавага ўзаемадзеяння. Максім Рыжанкоў выказаў упэўненасць, што ў краін-членаў ШАС прысутнічае палітычная воля ісці далей па фінансава-эканамічным трэку.

Яшчэ адна міжнародная пляцоўка, пра якую падчас нарады згадваў Прэзідэнт, — БРІКС. Міністр замежных спраў падкрэсліў, што Беларусь удзяляе абсалютна ва ўсіх мерапрыемствах пад парасонам БРІКС. «Мы імкнёмся не проста да такога спарадычнага ўдзелу, але да атрымання нейкага статусу ў гэтай арганізацыі. Статусу партнёра па супрацоўніцтве», — расказаў Максім Рыжанкоў, дадаўшы, што ўсе краіны-ўдзельніцы арганізацыі падтрымліваюць гэты статус. Пакуль стрымлівае толькі юрыдычнае афармленне гэтага статусу, не ў адносінах да Беларусі, а ў прынцыпе як юрыдычна тэрміна. «Будзем спадзявацца, што да саміту ў кастрычніку ён будзе выпрацаваны», — адзначыў Максім Рыжанкоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Нікалас Мадура перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Венесуэле

Дзейны прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура атрымаў перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у рэспубліцы. Ён пераабраны на трэці шасцігадовы перыяд. Пра гэта па выніках галасавання заявіў старшыня Нацыянальнага выбарчага савета (НВС) Венесуэлы Элвіс Амароса, паведаміла ТАСС. Ён апублікаваў першы бюлетэнь НВС, паводле якога пасля падліку 80 працэнтаў галасоў Мадуру падтрымалі 51,2 працэнта выбаршчыкаў. Амароса паведаміў, што затрымка з абвяшчэннем вынікаў выбараў была выклікана «нападам на сістэму перадачы даных» НВС. У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам першы выніковы бюлетэнь выпускаецца толькі пасля таго, як тэндэнцыя пры падліку галасоў стане незваротнай.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Нікаласа Мадуру з чарговай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы выказаў перакананне, што пад кіраўніцтвам Нікаласа Мадуры Венесуэла прадоўжыць упэўнена крочыць па шляху ўмацавання свайго суверэнітэту, развіцця кампетэнцый па шматлікіх кірунках. «Мінск гатовы прымаць у гэтым актыўны ўдзел», — падкрэсліў Прэзідэнт.***

## Аятала Хаменеі зацвердзіў Масуда Пезешкіана новым прэзідэнтам Ірана

Кіраўнік Ісламскай рэспублікі Іран аятала Алі Хаменеі афіцыйна зацвердзіў Масуда Пезешкіана на пасадзе новага прэзідэнта, паведаміла агенцтва Mehr. Паводле яго звестак, у пачатку цырымоніі міністр унутраных спраў Ірана Ахмад Вахідзі прадставіў афіцыйны даклад аб тым, як прайшлі датэрміновыя прэзідэнцкія выбары, падзякаваў іранскаму народу, супрацоўнікам ведамства за іх паспяховае правядзенне. Пасля аятала Хаменеі абвясціў дэкрэт, у адпаведнасці з якім Пезешкіян афіцыйна аб'яўлены дзявятым Прэзідэнтам Ісламскай рэспублікі Іран. Цяпер ён прынясе прысягу ў меджлісе (парламенце Ірана) 30 ліпеня. Пасля таго як 19 мая ў авіякатастрофе загінуў прэзідэнт Ірана Ібрагім Раісі, у краіне ў два туры прайшлі датэрміновыя прэзідэнцкія выбары.

# АПОРА НА ПАМЯЦЬ

**На гэтыя выхадныя Брэст — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі — адзначыў сваё 1005-годдзе. Цэнтральнымі мерапрыемствамі святочных дзён сталі акцыі, прымеркаваныя да вызвалення абласнога цэнтра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое адбылося 28 ліпеня 1944 года. У нядзелю ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылі помнік «Жывая памяць удзячных пакаленняў». У цырымоніі ўзяла ўдзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля ПЯТКЕВІЧ.**



Фота БелТА.

Помнік «Жывая памяць удзячных пакаленняў» усталявалі на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці, па суседстве з Рэспубліканскім цэнтрам патрыятычнага выхавання моладзі. Гэта другі помнік з трох. Першы быў устаноўлены ў 2022 годзе ў Мінску. Трэці з'явіцца ў Маскве. Збор манет для рэалізацыі праекта арганізаваны па ініцыятыве беларускага паралімпійца і грамадскага дзеяча Аляксея Талая. Ідэю падтрымалі сотні тысяч сем'яў з Беларусі і замежжа. Помнік складаецца з дзвюх частак. Каменны ліст-трохвугольнік — даніна мінуламу, бронзавае дрэва — увасабленне будучыні. У Брэсце права адкрыць манумент далі тром пакаленням адной сям'і: ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Аляксандру Грыгор'еву і яго нашчадкам.

Наталля Пяткевіч адзначыла, што беларусы — шчаслівыя людзі, бо ўмеюць шанаваць памяць і не баяцца гэтага рабіць, нягледзячы ні на што. Беларусь сур'ёзна пацярпела ў гады Вялікай Айчыннай вайны, кожная сям'я панесла страты.

«Унікальна тое, што прайшло 80 гадоў, але новыя аб'екты стварае моладзь. Гэта значыць, што памяць захавалася, што захавалася падзяка, пакланенне перад героямі-пераможцамі. Значыць, гэта трэба», — падкрэсліла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Яна прывяла ў прыклад Аляксея Талая, які ініцыіраваў стварэнне памятнага знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў».

Адкрыццё помніка стала часткай акцыі «Дарогамі славы», прысвечанай 80-й гадавіне Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Багратыён». Прысутныя ўсклалі кветкі да падножжа манумента, ушанавалі памяць абаронцаў Айчыны хвілінай маўчання. Таксама падчас цырымоніі была закладзена памятная капсула з пасланнем нашчадкам. Жадаючыя змаглі апусціць у колбу свае манеткі, далучыўшыся да стварэння трэцяга манумента — у Маскве.

Наталля Пяткевіч азнаёмілася з ходам будаўніцтва патрыятычнага цэнтра. «Абсалютна глабальны праект, вельмі цікава задуманы. Выдатна, што ён здольны ахапіць вельмі вялікую колькасць хлопчыкаў і дзяўчынак. Упэўнена, ён будзе запатрабаваны не толькі ў плане нейкага навучання па лініі Міністэрства адукацыі, такога сістэмнага. Даю гарантыю, што гэта будзе абсалютна запатрабаваны і з камерцыйнага пункту гледжання праект», — пераканана першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. На яе думку, патрыятычны цэнтр у Брэсцкай крэпасці будзе прыцягальны і для дзяцей з краін СНД.

«Думаю, наша краіна сёння — сапраўдны маяк міралюбнасці і міралюбівай палітыкі, якая павінна мець месца. На жаль, тыя «настаўнікі», якія спрабуюць нас вучыць іншаму, — як у песні Beatles The Fool on the Hill («Дурань на ўзгорку»). У сваім навучанні яны часам выглядаюць не маяком, а менавіта як дурань на гары. Тое, што робіцца тут, і ёсць тыя апоры, якія могуць прынесці на зямлю мір: наша памяць, канкрэтныя дзеянні па правядзенні міралюбівай палітыкі і галоўнае — выхаванне людзей і дзеянні людзей у гэтым кірунку», — рэзюмавала першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Фінальным акордам рэспубліканскай акцыі «Дарогамі славы» стаў святочны канцэрт у Брэсце, прысвечаны 80-годдзю вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч выказала падзяку штабу патрыятычных сіл за правядзенне інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Дарогамі славы».

**Паводле БелТА.**

---

Сезонны клопат

# РЫХТУЙ ФОРМУ ЛЕТАМ

**На Віцебшчыне сёлета за парты сядуць каля 114 тысяч школьнікаў у 306 установах сярэдняй адукацыі, першакласнікамі стануць 10,7 тысячы дзяцей, а ў дзіцячыя садкі прыйдуць 39 тысяч малых. У медыяцэнтры Віцебскай вобласці адбыўся круглы стол, на якім абмеркавалі падрыхтоўку да новага навучальнага года.**

## Капітальны рамонт і новы прадмет

З 1 верасня ў 10-х класах з'явіцца новы інтэграваны курс "Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі". У лютым з удзелам настаўнікаў-практыкаў адбыліся дыялогавыя пляцоўкі па абмеркаванні дадзенага падручніка, які добра ілюстраваны, змяшчае дадатковыя спасылкі, навігацыю. З пункту гледжання патрыятычнага выхавання гэта дасць магчымасць падрастаючаму пакаленню больш узважана ставіцца да тых падзей, якія адбываліся ў нашай краіне.

Абнавілі праграмы факультатываў класаў прафнакіраванасці, цяпер яны будуць улічваць рэгіянальны кампанент. «Гэта класы педагагічнай, спартыўна-педагагічнай, аграрнай накіраванасці. Прыняты новыя праграмы факультатываў па музычнай накіраванасці, тых заняткаў, якія працуюць на развіццё сацыяльнай актыўнасці вучняў, іх сацыялізацыю ў грамадстве, фарміраванне іх інфармацыйнай культуры і кампетэнцый», — расказала **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі аблвыканкама Алена БАГДАНОВІЧ.**

На падрыхтоўку ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі да новага навучальнага года сёлета выдзелена каля 42 мільёнаў рублёў. Цяпер капітальныя рамонты будынкаў вядуцца ў дзевяці школах паўночнага рэгіёна. Да 1 жніўня падрыхтоўка ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі павінна быць завершана. Падпісанне пашпартоў гатоўнасці будзе ажыццяўляцца да 20 жніўня.



## Восем школьных кірмашоў

«Пашыраны продаж тавараў да новага навучальнага года пачнецца з 1 жніўня. Правядзенне школьных кірмашоў запланавана ў Віцебску і сямі райцэнтрах — Докшыцах, Лепелі, Бешанковічах, Лёзне, Мёрах, Паставах і Шаркаўшчыне. Усю інфармацыю пра месца і час іх правядзення можна будзе знайсці на сайтах гарадскіх і райвыканкамаў і ў рэгіянальных СМІ», — адзначыла **начальнік аддзела спажывецкага рынку галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг аблвыканкама Таццяна ЖЫНКЕВІЧ.**

На Віцебшчыне большай папулярнасцю ў бацькоў школьнікаў карыстаюцца стацыянарныя гандлёвыя аб'екты, у якіх праводзяцца дысконтныя акцыі, дні зніжак, а таксама можна скарыстацца картамі растэрміноўкі. У некаторых крамах прапануюць і зніжкі для шматдзетных і маламаёмных сем'яў. Акрамя таго, пакупнікоў прыцягваюць камфортныя ўмовы для прымеркі адзення і падбору патрэбных прылад. У апошні час шматлікія сем'і актыўна сталі набываць школьныя тавары праз інтэрнэт-крамы.

Да новага навучальнага года ў гандлёвых сетках вобласці прадстаўлена амаль 400 мадэляў адзення дзелавога стылю для хлопчыкаў і дзяўчынак, каля 120 мадэляў абутку, 50 мадэляў ранцаў, сумак, заплечнікаў, ёсць шырокі асартымент канцылярскіх і папяровых тавараў. Асартымент абутку і адзення прадстаўлены ў асноўным таварамі беларускіх вытворцаў. Арыенціровачны кошт камплекта адзення для хлопчыкаў складае ад 146 да 400 рублёў, для дзяўчынак — ад 100 да 350. Набор пісьмовых прылад каштуе ад 84 да 110 рублёў.

## Падтрымка і дапамога

«Сёлета традыцыйна аказана дапамога ў падрыхтоўцы да школы 11 тысячам сем'яў, а гэта 22,5 тысячы дзяцей са шматдзетных сем'яў. Акрамя таго, мы аказваем падтрымку і іншым катэгорыям, не застануцца без увагі малазабяспечаныя сем'і, сем'і з дзецьмі-інвалідамі. Звяртацца па гэтым пытанні варта ў ТЦСАН рай- і гарвыканкамаў, віцебскія аддзелы адукацыі адміністрацый раёнаў. Гэту дапамогу вылучаюць гарадскія і раённыя выканкамы на падставе сваіх рашэнняў. Звычайна яна складае 30 % бюджэту пражытачнага мінімуму, на сёння гэта 125 рублёў на кожнае дзіця», — расказала **першы намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Ірына ГАЛАДЗЮК.**

Не застануцца ўбаку і актывісты БРСМ. З 1 жніўня да 10 верасня на Віцебшчыне пройдзе дабрачынная акцыя «У школу з добрым сэрцам!», у рамках якой моладзь збярэ канцылярскія тавары для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў і тых, хто пражывае ў інтэрнатных установах. У кожным камітэце БРСМ, а таксама ў гандлёвых пунктах рэгіёна будзе арганізавана месца збору. У пакупнікоў з'явіцца рэальная магчымасць набыць неабходныя тавары і падарыць іх тым, хто ў іх мае патрэбу. Толькі за мінулы год у рамках акцыі арганізавалі каля 90 мерапрыемстваў з удзелам звыш дзвюх тысяч валанцёраў.

***Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,***
**фота аўтара.**

---

З нагоды

# Кітайска-беларускія адносіны захоўваюць высокі ўзровень развіцця

## У Мінску адзначылі 97-годдзе стварэння НВАК

**Кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства захоўваюць высокі ўзровень развіцця. Важнасць гэтага адзначыў аташэ па пытаннях абароны пасольства КНР у Беларусі старшы палкоўнік Лю Чжэ на ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды 97-годдзя з дня стварэння Народна-вызваленчай арміі Кітая.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Пад стратэгічным кіраўніцтвам лідараў дзвюх дзяржаў кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства захоўваюць высокі ўзровень развіцця. Прыемна адзначыць, што апошнія гады ваенныя адносіны паміж Кітаем і Беларуссю таксама дынамічна развіваюцца, — заявіў аташэ па пытаннях абароны. — Мы актыўна ўзаемадзейнічаем па такіх кірунках, як бесперапынны рост абмену ваеннымі дэлегацыямі на высокім узроўні, далейшае паглыбленне і пашырэнне сумесных трэніровак, вучэнняў. Наладжана цеснае супрацоўніцтва ў прафесійных ваенных сферах».

Лю Чжэ адзначыў важнасць таго, што 3 ліпеня атрад ганаровай варты НВАК узяў удзел у ваенным парадзе, прысвечаным 80-годдзю вызвалення Беларусі. «У Беларусі паспяхова праходзіць кітайска-беларуская сумесная антытэрарыстычная трэніроўка. Гэта яшчэ раз паказвае высокі ўзровень ваенных адносін паміж дзвюма краінамі», — падкрэсліў аташэ па пытаннях абароны.

Старшы палкоўнік звярнуў увагу на тое, што зараз адбываюцца беспрэцэдэнтныя змяненні: свет уступіў у новы перыяд узрушэння і пераўтварэнняў, перад ім стаяць новыя сур'ёзныя выклікі. «На фоне ўсяго гэтага Сі Цзіньпін вылучыў ініцыятыву па глабальнай бяспецы, якая адстойвае дух адзінства, адказвае на складаныя і ўзаемазвязаныя выклікі бяспекі з перспектывай сумеснага выйгрышу», — падкрэсліў аташэ па пытаннях абароны.

Як заўважыў Лю Чжэ, кітайскі народ любіць і шануе мір, імкнецца да міру. «Рушыць шляхам мірнага развіцця — непахісная нацыянальная воля і стратэгічны выбар Кітая, — падкрэсліў аташэ па пытаннях абароны. — Кітай няўхільна праводзіць незалежную і самастойную мірную знешнюю палітыку і абарончую палітыку нацыянальнай абароны».

Як лічыць старшы палкоўнік, Узброеныя сілы Кітая ніколі нікому не кідалі выклік і не пагражалі іншым: «Гісторыя даказвала і працягне даказваць, што кітайская армія — гэта заўсёды цвёрдая сіла для абароны міру ва ўсім свеце. Яна поўная рашучасці і здольная абараняць нацыянальны суверэнітэт, бяспеку і інтарэсы развіцця».

Аташэ па пытаннях абароны запэўніў, што Кітай гатовы і ў далейшым умацоўваць з Беларуссю ваеннае супрацоўніцтва на карысць нашых дзяржаў і народаў і сумесна робіць вялікі ўнёсак ва ўмацаванне міру ва ўсім свеце і рэгіянальнай стабільнасці.

Як заявіў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ,** для Беларусі супрацоўніцтва з Кітаем з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам знешняй палітыкі. Паводле яго слоў, надзейным фундаментам развіцця сувязяў служаць адносіны дружбы паміж дзвюма дзяржавамі, якія гістарычна склаліся.

— У нашай агульнай гісторыі — гісторыя баявога брацтва і гераізму двух народаў у барацьбе з сусветным фашызмам і мілітарызмам, — падкрэсліў Леанід Касінскі. — Цяпер мы вядзём даверны палітычны дыялог, узгадняем пазіцыі на міжнароднай арэне, усебакова развіваем узаемадзеянне ў розных сферах.

Памочнік міністра абароны лічыць, што ў аснове дружбы Беларусі і Кітая — сяброўскія адносіны паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў Аляксандрам Лукашэнкам і Сі Цзіньпінам. «Развіццё Народна-вызваленчай арміі Кітая будзе і ў далейшым служыць умацаванню рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі, партнёрскіх адносін з дружалюбнымі Кітаю краінамі, сярод якіх і Беларусь», — перакананы Леанід Касінскі.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# Што такое сапраўдны суверэнітэт, і з чаго ён зараджаўся

**Беларусь сёння з'яўляецца адным з паспяховых прыкладаў будаўніцтва суверэннай дзяржавы. Наша краіна дэманструе ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё, палітычную стабільнасць, міжнацыянальны і міжканфесійны мір. Ключавое значэнне ў гэтым адыграў інстытут прэзідэнцтва, які з'яўляецца не проста органам дзяржаўнага кіравання, а найважнейшай умовай захавання суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. Карэспандэнт «Звязды» наведаў гісторыка-тэарэтычную рэканструкцыю станаўлення інстытута прэзідэнцкай улады ў Беларусі і свеце, у ходзе якой спікеры адказалі на галоўнае пытанне ролі інстытута прэзідэнцтва ва ўмовах пераходнага перыяду развіцця дзяржавы.**




## «Ён мог абаперціся толькі на народ»

«Гісторыя паказала, што без моцнага палітычнага лідара, без харызматычнага палітычнага лідара, без лідара, адданага свайму народу і сваёй дзяржаве, будучыні ў краіны няма», — лічыць **загадчык Цэнтра гісторыі Беларусі канца XVIII—XXI стагоддзя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, дацэнт Мікалай СМЯХОВІЧ.**

Гаворачы аб велізарнай колькасці адміністрацыйнага партыйнага і савецкага апарату СССР, ён задаў пытанне: «Якую яны ролю адыгралі ў захаванні савецкай дзяржаўнасці?» І адразу ж адказаў: «Яны не адыгралі ніякай ролі, таму што не знайшлося лідара, моцнай палітычнай асобы, адданай народу і дзяржаве. Таму савецкая дзяржава, уласна кажучы, загінула».

Мікалай Смяховіч адзначыў: у тым ліку зыходзячы з гэтага вопыту, Аляксандр Лукашэнка ўсвядоміў, што без моцнай палітычнай асобы, без палітычнага лідара будучыня ў Беларусі даволі складаная. Вучоны таксама падкрэсліў факт народнай падтрымкі будучага Прэзідэнта ў 1990-х гадах. «Палітычныя сілы, якія прадстаўлялі заканадаўчую ўладу, былі фактычна супраць Прэзідэнта. На каго Аляксандр Рыгоравіч мог абаперціся? Ён мог абаперціся толькі на народ», — заўважыў ён.

Па словах гісторыка, падтрымка народа ў Аляксандра Лукашэнкі была. «А яму больш не было на каго абаперціся. Так склалася гістарычная сітуацыя, што толькі на народ у форме Усебеларускага народнага сходу. А больш ніяк немагчыма было вырашыць гэту сітуацыю з тым, каб рэалізаваць ідэю ўмацавання ўлады з мэтай пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі», — сказаў ён.

## «Арбітр, які каардынуе цэнтр дзейнасці органаў улады»

«Вельмі важную і цікавую з'яву на дадзены момант мы назіраем і ў дзяржаўным будаўніцтве, і ў канстытуцыйным будаўніцтве», — сказала **суддзя Канстытуцыйнага Суда Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.** — Яшчэ на світанку станаўлення інстытута прэзідэнцтва асновай і падмуркам стаў народны давер. Давер народа Прэзідэнту, каб выбудоўваць у далейшым дзяржаву, у якой мы павінны былі жыць».

Паводле змяненняў і дапаўненняў, унесеных у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 27 лютага 2022 года, Усебеларускі народны сход стаў канстытуцыйным органам. Паводле слоў Святланы Любецкай, гэта стала абсалютна новым, паступальным, пры захаванні пераемнасці і найлепшых напрацовак, этапам развіцця дзяржавы. Разам з гэтым адбываецца трансфармацыя ў аптымальныя формы дзейнасці дзяржавы з выкарыстаннем народаўладдзя, сілы і розуму народа на аснове вельмі выразных прававых пазіцый.

Суддзя Канстытуцыйнага Суда звярнула ўвагу, што інстытут прэзідэнцтва з моцнай прэзідэнцкай уладай, які ў свой час атрымаў заканадаўчае афармленне і вырашыў тыя пытанні пераходнага перыяду, якія на яго ўскладаліся, у далейшым не застаўся закасцянелым, нязменным інстытутам. «Як жыццё ставіла пытанні, так і развіваўся інстытут прэзідэнцтва, — сказала яна. — Што важна, канстытуцыйны рэферэндум 2022 года замацаваў тыя падыходы і палажэнні ў змяненні канстытуцыйна-прававога статусу, якія выраслі з практычных напрацовак, тых падзей, рашэнняў, мерапрыемстваў, якія праводзіліся Прэзідэнтам. Гэта не нейкія надуманыя паўнамоцтвы альбо іх надуманая карэкціроўка. Рэферэндум фактычна завяршыў трансфармацыю інстытута прэзідэнцтва. І паглядзіце, на якім узроўні», — падкрэсліла яна.

Сёння Прэзідэнт, бясспрэчна, з'яўляецца ключавой фігурай у сістэме органаў дзяржаўнай улады, ён валодае самастойнай прэзідэнцкай уладай. «Гэта арбітр, які каардынуе цэнтр дзейнасці органаў улады. Ён накіроўвае, дае ацэнку, узаемадзейнічае, — дадала суддзя Канстытуцыйнага Суда. — Факт пераразмеркавання паўнамоцтваў сведчыць аб даверы і Прэзідэнта, і народа органам улады, што накладае на іх адказнасць і за рашэнні, што прымаюцца, і за дзеянні. Гэта зусім іншы, патэнцыяльна больш высокі ўзровень развіцця».

Усе гэтыя этапы развіцця замацаваны ў Асноўным Законе краіны. «Гэта прававы шлях, зразумелы ўсім, выразны. Ён не можа залежаць ад нейкіх імгненных знешніх змен, уплываў і гэтак далей. І гэта асабліва Прэзідэнт. Ён глядзіць на гэту перспектыву вельмі добра бачыць, ініцыіруе і накіроўвае вельмі граматна», — падагульніла Святлана Любецкая.

## Што ўключае ў сябе дзяржаўны суверэнітэт?

Пра гэта распавяла **намеснік дырэктара — кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававой інфармацыі Беларусі, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Алена СЯМАШКА.**

«Важна разумець, што электаральны, інфармацыйны і любыя іншыя віды суверэнітэту — гэта толькі пэўныя складовыя часткі адзінага паняцця «дзяржаўны суверэнітэт», якое замацавана ў нашай Канстытуцыі і з'яўляецца ключавым для паняцця «дзяржава», — сказала Алена Сямашка. — Дзяржава ж становіцца такой толькі тады, калі набірае пэўны набор істотных прыкмет, сярод якіх дзяржаўны суверэнітэт. Гэта паняцце азначае не толькі незалежнасць дзяржаўнай улады, але і яе вяршэнства — абсалютны паказчык, паколькі не можа быць вяршэнства поўнага або частковага».

Што датычыцца электаральнага суверэнітэту, кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў адзначыла, што гэта паняцце мае на ўвазе магчымасць праводзіць выбарчыя працэдуры, абапіраючыся толькі на ўласнае заканадаўства і інтарэсы беларускага народа і дзяржавы. «Любыя іншыя ўплывы магчымыя, але толькі з пункту гледжання дадатковых экспертных ацэнак, парад, як можна яшчэ палепшыць, напрыклад, сістэму або заканадаўства. Але яны могуць успрымацца і павінны фармулявацца выключна ў такім духу. Гэта значыць, замежныя назіральнікі, якіх заўсёды шмат было і будзе на нашых выбарах, могуць назіраць — для таго, каб выказаць свае меркаванні, даць, магчыма, парады», — падкрэсліла Алена Сямашка.

Па яе словах, абвяшчальны электаральны суверэнітэт як прынцып правядзення любой выбарчай кампаніі, мы гаворым усім вакол, што мы адкрытыя для дыялогу, мы пастаянна вывучаем усе магчымыя практыкі для таго, каб разумець, як развівацца далей.

Алена Сямашка дадала, што мажарытарная выбарчая сістэма — тая мадэль, якая паказала сябе найбольш эфектыўна на дадзеным этапе развіцця беларускай дзяржавы. «Зрэшты, працуючы над абноўленай Канстытуцыяй, члены Канстытуцыйнай камісіі зазіралі за гарызонт па даручэнні Прэзідэнта, мяркуючы, што пры больш інтэнсіўным развіцці палітычнай сістэмы і пры патрэбнасці і запыце народа ў перспектыве магчымы пераход на іншыя мадэлі выбарчых сістэм», — сказала яна.

## Гарачая вада, святло, прадукты і школы

Развіццё інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі стала магчымым дзякуючы нацыянальнаму лідару. Пра гэта заявіў **намеснік старшыні Беларускай партыі «Белая Русь», член Рэспубліканскага савета РГА «Белая Русь» Андрэй БУГРОЎ.**

Ён заўважыў, што інстытут прэзідэнцтва для беларусаў у 1990-я гады быў чымсьці новым. «Мы доўга жылі пад кіраваннем вядучай Камуністычнай партыі ў савецкія часы. І, вядома, простым грамадзянам было незразумела, што за інстытут, які ён будзе дзейнічаць, хто такі Прэзідэнт», — сказаў ён.

«Разам з тым інтарэсы ўлад, у прыватнасці Вярхоўнага Савета, былі вельмі спецыфічныя, — адзначыў Андрэй Бугроў. — Мы ведаем, якім чынам вырашаліся пытанні ў інтарэсах народа, калі ішло зацягванне вырашэння таго ці іншага пытання на тыдні, месяцы».

Па яго словах, інстытут прэзідэнцтва з яркім, моцным лідарам на чале для людзей стаў добрым рашэннем, і грамадзянская супольнасць прагаласавала за Прэзідэнта, які сваёй харызмай пачаў фарміраваць новы падыход і паняцце інстытута прэзідэнцтва.

Намеснік старшыні партыі адзначыў, што не ведае, як бы развіваўся інстытут прэзідэнцтва, калі б на пасаду Прэзідэнта прыйшоў іншы чалавек. «Але, дзякуючы нашаму Прэзідэнту, дзякуючы Аляксандру Рыгоравічу, мы бачым дзейснасць інстытута прэзідэнцтва на тэрыторыі нашай краіны, — сказаў ён. — Да ўлады прыйшоў чалавек, які валодаў пытаннямі ад зямлі, ад сельскай гаспадаркі і да ваенной справы, разбіраўся ў гэтым. Вядома, народ паверыў і прагаласаваў за такога нацыянальнага лідара, бо для беларусаў на той момант аператыўнае рашэнне праблемных пытанняў было вельмі важна. Час працаваў супраць нас, і мы бачылі, што адбывалася тады. А цяпер мы ўсе з вамі сапраўды жывём у цудоўнай краіне і не думаем на працягу 30 гадоў, што нас чакае заўтра. Мы з вамі прачынаемся і ведаем, што ў нас будзе заўсёды гарачая вада, будзе святло, у нашых халадзільніках будуць ляжаць прадукты, якімі мы будзем карміць нашых дзяцей, будзем іх адпраўляць у школы, якія будуць абавязкова працаваць», — дадаў Аляксандр Бугроў.

Ён падкрэсліў, што стабільнасць у Беларусі — гэта заслуга інстытута прэзідэнцтва і непасрэдна нашага нацыянальнага лідара. А развіццё гэтага інстытута стала магчымым дзякуючы асобна ўзятай асобе — народнаму Прэзідэнту. Паводле яго слоў, інстытут прэзідэнцтва — гэта вечны рухавік у нашай дзяржаве, які будзе працаваць і працаваць, таму што сістэма адладжаная, яна не дае ніякіх збояў. А беларускі прыклад бярэцца многімі дзяржавамі.

## Станоўчая дынаміка

Інстытуты прэзідэнцтва існуюць у многіх краінах. Але менавіта палітычная воля лідара, мудрасць і апора на народ забяспечваюць эфектыўнае функцыянаванне і саміх гэтых інстытутаў, і паспяховую рэалізацыю ўсіх кірункаў сучаснай дзяржаўнай палітыкі. Пра гэта заявіў **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт Мікалай МЫСЛІВЕЦ.**

«Інстытут прэзідэнцтва — складаны механізм. Безумоўна, мы гаворым пра ролю нацыянальнага лідара, і гэта абсалютна справядліва. Але не будзем забываць, што дадзены механізм дынамічна развіваецца. І калі мы гаворым аб далейшай яго эвалюцыі, у якасці найважнейшых крытэрыяў эфектыўнасці яго дзейнасці мы павінны гаварыць аб захаванні і ўмацаванні суверэннай беларускай дзяржавы, захаванні нашай незалежнасці, аб змесце тых змяненняў, якія адбываюцца ў эканамічным, грамадска-палітычным развіцці краіны. І аб задавальненні патрэб людзей», — сказаў Мікалай МысліВец.

Па яго словах, інстытут прэзідэнцтва валодае неабходнымі рэсурсамі: эканамічнымі, сацыяльнымі, інтэлектуальнымі. Гэта выразна структураваная сістэма, якая забяспечвае рэалізацыю абсалютна ўсіх кірункаў дзяржаўнай палітыкі. І цалкам справядліва, што галоўную ролю ў функцыянаванні гэтага механізма адыгрывае Прэзідэнт. Падобныя інстытуты існуюць у многіх краінах, але ўсе мы разумеем, што менавіта палітычная воля лідара, мудрасць і апора на народ забяспечваюць эфектыўнае функцыянаванне не толькі інстытута прэзідэнцтва, але і паспяховую рэалізацыю ўсіх кірункаў сучаснай дзяржаўнай палітыкі.

«Адным з найважнейшых крытэрыяў эфектыўнасці інстытута прэзідэнцтва і паспяховасці рэалізацыі дадзенай палітыкі з'яўляецца зваротная рэакцыя, якая выяўляецца ў тым ліку ў ступені задаволенасці вынікамі эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў, якую фіксуюць сацыёлагі, праводзячы рознага роду сацыялагічныя даследаванні», — падкрэсліў дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН.

Ён паказаў вынікі некаторых сацыялагічных даследаванняў 2004 і 2024 гадоў. У кожным даследаванні апытвалася каля дзвюх тысяч рэспандэнтаў. «Дынаміка наглядна і пераканаўча пацвярджае эфектыўнасць усіх пераўтварэнняў, якія адбываліся і працягваюць адбывацца ў нашай краіне. Так, крыху больш чым восем працэнтаў жыхароў нашай краіны ў 2004 годзе ацэньвалі сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі як добрае і крыху больш чым 50 працэнтаў як сярэдняе. У гэтым годзе амаль 30 працэнтаў ацэньваюць становішча як добрае і 47 працэнтаў як сярэдняе. Так, удзельная вага тых, хто пазітыўна ацэньвае сацыяльна-эканамічнае становішча ў краіне значна вырасла, а доля тых рэспандэнтаў, якія ацэньваюць гэтае становішча як дрэннае, паменшылася больш чым у два разы», — дадаў сацыёлаг.

За 20 гадоў больш чым у два разы павялічылася доля тых, хто ацэньвае матэрыяльнае становішча сваёй сям'і як добрае, у некалькі разоў павялічылася доля тых, хто ацэньвае гэтае становішча як сярэдняе. «У 2004 годзе практычна кожны трэці беларус ацэньваў становішча сваёй сям'і як дрэннае, сёння ж — гэта ўсяго 13,6 працэнта ад агульнай колькасці рэспандэнтаў. Гэтая дынаміка сведчыць пра многае і з'яўляецца адным з відавочных паказчыкаў эфектыўнасці тых змяненняў, якія адбываюцца ў сацыяльна-эканамічным развіцці нашай краіны», — сказаў Мікалай МысліВец.

Дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН таксама адзначыў, што за 20 гадоў значна вырас працэнт даверу насельніцтва да органаў дзяржаўнай улады, Савета Міністраў, Нацыянальнага сходу, мясцовых органаў улады і сілавых структур. «Гэта сведчыць аб тым, што палітыкі і дзяржава ў цэлым эфектыўна выконваюць ускладзеныя на іх задачы», — падагульніў ён.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

# У МСЦІСЛАВЕ БУДУЮЦЬ УСТОЙЛІВАЕ ЗАЎТРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)






## Акадэмія МУР

Так называецца Мсціслаўская гімназія — мозг і рухавік распрацаванай стратэгіі. Тут адбылася выстаўка-прэзентацыя тых ініцыятыў, якія ўжо рэалізаваныя, і прайшло пашыранае пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці Мсціслаўскага раёна. Цэнтр устойлівага развіцця, які тут працуе, з'яўляецца абласным рэсурсным інавацыйным для рэалізацыі МУР. Як вядома, мэт існуе 17, і ўсе яны ўзаемазвязаныя паміж сабой. Ліквідацыя голаду, забеспячэнне здаровага ладу жыцця, усёахопная і справядлівая якасная адукацыя, рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў і санітарыя, доступ да недарагіх, надзейных, устойлівых і сучасных крыніц энергіі... Больш дэталёва з імі можна азнаёміцца на сайце гімназіі ў раздзеле «Акадэмія МУР».

— Наша мэта — давядзенне пэўнай інфармацыі да як можна большай колькасці людзей, — паведаміў **настаўнік інфарматыкі Сяргей КАЛЬЦОЎ.** — Чым болей грамадзян падумае пра ўстойлівае развіццё, тым больш верагоднасць таго, што мы будзем устойліва развівацца. 17 мэт МУР — гэта ўсё наша жыццё. Мы найбольшую ўвагу аддаём энергазберажэнню. Нашымі інавацыйнымі рэсурсамі карыстаецца ўся вобласць, але больш актыўна раён. Бо ў развіцці стратэгіі зацікаўлены наш райвыканкам і, у прыватнасці, аддзел па адукацыі. Ён нас падтрымлівае, таму ўсе школы ўцягнутыя ў працэс.

На сённяшні дзень Акадэміяй МУР падрыхтаваны матэрыял для дзевяці мэт устойлівага развіцця. Гэтыя матэрыялы выкладзены на сайце і з імі можна азнаёміцца больш дэталёва. Магчыма, і дадаць нешта сваё.

— Асобны праект «Задачы МУР у задачах, прыкладах і турнірах», — кажа суразмоўнік. — Праводзім інтэрактыўныя турніры. Апошні датычыўся сёмай мэты — гэта недарагая, чыстая энергія. Правялі аж чатыры турніры. Усе навучэнцы гімназіі праходзяць такі турнір. Потым рабілі вялікі турнір для 5—11 класаў усіх навучальных устаноў Мсціслаўскага раёна. І супертурнір, калі ў наш кабінет інфарматыкі запрасілі каманды з усіх школ, і тыя дзве гадзіны спаборнічалі. Мы паспрабавалі інтэрактыўным спосабам апытаць падлеткаў, як яны разумеюць інфармацыю, што мы ім далі.

Летась гімназія выйграла першы ў вобласці прыз пад мэту «Экалогія». А сёлета ў шостым абласным рэгіянальным форуме па ўстойлівым развіцці атрымала першае месца. Стымул вялікі, бо перамогі ў конкурсах прыносяць яшчэ і фінансы на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы.

— За другі наш выйгрыш памянялі вокны ў класах, зрабілі вулічнае асвятленне, — расказвае **дырэктар школы Андрэй КАЗАКОЎ.** — За апошнія 100 тысяч рублёў, якія мы выйгралі, абнаўляем на харчблоку абсталяванне: закупілі дзве індукцыйныя пліты, два паравектаматы, дзве маразільныя скрыні, будзе яшчэ кацёл варачны, цалкам замянілі асвятляльнае абсталяванне ў кабінетах на энергазберагальныя лямпы. У планах замяніць асвятленне яшчэ і ў калідорах.

## Мэты ва ўсіх аднолькавыя

Актыўна ўдзельнічаюць у стратэгіі ўстойлівага развіцця дэпутаты. На выстаўцы яны паказалі вынікі сваёй дзейнасці.

— Мы разумеем свае праблемы і, сыходзячы з іх, будуем сваё будучае, — кажа **старшыня Падсолтаўскага сельсавета Аксана ЛІСОЎСКАЯ.** — Асноўная наша праблема была — землі і дамы, што пустуюць. Тыя будынкі, якія ні на што не годныя, мы выкарыстоўваем на рамонт дарог. Робім яго сваімі сіламі, выкарыстоўваючы бут ад разбураных дамоў. Разабраць іх дапамагае спецыялізаваная арганізацыя. Такім чынам у нас зроблены дарогі ў Рубанаўцы, Сакалоўцы. Гэта малыя населеныя пункты, дзе ўсяго каля 20 дамоў і жывуць у асноўным пенсіянеры. Мы вырашаем справы, не выкарыстоўваючы бюджэтныя грошы. Мы разумеем, што стратэгію ўстойлівага развіцця зможам рэалізаваць толькі тады, калі будзе сумесная работа, калі зацікавім моладзь. Сёлета праводзілі акцыю «Дэпутат побач», дзе расказвалі маленькім дзеткам, што такое мясцовае самакіраванне; паказвалі, як праводзяцца выбары знутры. Мы праводзім сумесныя суботнікі — Дзень вёскі Шамава і Дзень вёскі Светлава. Спыталіся ў людзей, што яны хацелі б змяніць у сваіх населеных пунктах. Нехта казаў пра калодзеж, нехта пра могілкі, прапаноўвалі паставіць памятны знак, прыбраць звалку, прагрэйдзіраваць дарогі, абрэзаць дрэвы, адрамантаваць прыпынак грамадскага транспарту, паставіць лаўку. А мы вырашалі, што зможам зрабіць самі, а што — з дапамогай арганізацый.

**Старшыня Ракшынскага сельсавета Алена СЕЛЯЗНЁВА** пахвалілася, што сёлета атрымалася рэалізаваць праект «Чыстая вада»: пачысцілі калодзежы ў некалькіх вёсках. Насельніцтву вельмі дапамагае мясцовая гаспадарка ААТ «Сцяг працы», дзе задзейнічана каля 200 чалавек. Напрыклад, разам добраўпарадкоўваюць тэрыторыю. Дапамагаюць дасягнуць мэт устойлівага развіцця і выхадцы з гэтых мясцін. Ураджэнец вёскі Андраны Юрый Шамалаў, які працуе і жыве цяпер у Санкт-Пецярбургу, пабудаваў на малой радзіме капліцу за свой кошт, а летась падарыў сельсавету дзве электракасы «Штыль». Яшчэ адзін прадпрымальнік дапамог зарыбіць возера.




Самы маленькі сельсавет на тэрыторыі раёна — Мушынскі. Там жыве ўсяго 487 жыхароў. Пры гэтым у тым ліку дзевяць шматдзетных сем'яў! Пяць жанчын узнагароджаны Ордэнамі маці.

— У 2019 годзе адкрылі дзіцячую гульнявую пляцоўку і працягваем яе напаўняць і добраўпарадкоўваць, — расказала **старшыня сельсавета Алена МІХНЕВІЧ.** — Клопат пра будучае пакалення — наш унёсак ва ўстойлівае развіццё. Разам з моладдзю прывялі ў парадак крынічку, з дапамогай насельніцтва зрабілі калодзежы ў вёскі Дубна.

**Старшыня Краснагорскага сельсавета Людміла КАВАЛЁВА** лічыць прыярытэтным кірунак па ўстойлівым развіцці тэрыторый адкрыццё аграсядзіб. Адна з такіх пад назвай «Духмяны сад» у Кароўчыне славіцца на ўсю краіну. Яе заснавальнікі выйгралі ў праекце, прысвечаным агратурызму. На грошы, якія ім выдзелілі, купілі цяпліцу 240 квадратных метраў і вырошчваюць там агародніну. На тэрыторыі сядзібы шмат пладовых дрэў і кустоў.

— Гэта першая аграсядзіба на сяле, дзе ёсць дамашняя піцэрыя, — кажа Людміла Кавалёва. — Тут і адпачынак, і апрацоўка агародніны і ягад. Гаспадары і пасцілу самі робяць, і зефір, тарты на заказ пякуць. Да іх ездзяць аўтобусамі. Яны для дзяцей і дарослых розныя майстар-класы арганізуюць. Аграсядзіба «Духмяны сад» уключана ў турыстычны маршрут.

**Старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА** адзначае, што стратэгія ўстойлівага развіцця Мсціслаўскага раёна з самага пачатку праводзіцца дэпутатамі сумесна з выканаўчай уладай.

— У нас у раёне гэтай стратэгіяй ахоплены ўсе, пачынаючы ад выхаванцаў дзіцячых садкоў і заканчваючы арганізацыямі і прадпрыемствамі, — кажа дэпутат. — Наша задача — зрабіць жыццё ў малых населеных пунктах больш прывабным. Для народнага выбранніка асноўны кірунак — работа з насельніцтвам па рэалізацыі розных грамадскіх ініцыятыў, прыцягненне жыхароў да сумесных работ па павышэнні якасці жыцця на сяле.

## І ніякага ўтрыманства

**Намеснік старшыні райвыканкама Вольга Мікалаеўна СУДЗІЛОЎСКАЯ,** якая распрацавала Стратэгію ўстойлівага развіцця раёна, звяртае ўвагу на тое, што Мсціслаўшчына мае вялікі патэнцыял для развіцця. Тут паспяхова развіваецца сельскагаспадарчы кірунак, працуе 10 сельскагаспадарчых арганізацый, 20 сялянска-фермерскіх гаспадарак. У 2021 годзе пры падтрымцы Магілёўскага аблвыканкама рэалізаваны інвестпраект па мадэрнізацыі свінакомплексу на 30 тысяч пагалоўя. Развіваецца перапрацоўка сельгаспрадукцыі, у рамках выканання даручэння «Адзін раён — адзін праект» рэалізуецца праект па пашыве адзення. Мсціслаў лічыцца ў Беларусі другім Суздалем. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 22 помнікі архітэктуры, 54 — археалогіі і па адным — гісторыі і нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека. З улікам усяго гэтага і стваралася Канцэпцыя па напісанні стратэгіі ўстойлівага развіцця Мсціслаўскага раёна да 2035 года, выдзяляліся праблемныя моманты і ствараўся вобраз пажаданага будучага. Жыхары бачаць Мсціслаўскі раён у будучым экалагічна чыстым, турыстычна прывабным, інавацыйна развітым, інклюзіўным.

— Наш праект аб'ядноўвае самых прагрэсіўных і ініцыятыўных маладых людзей, — адзначае **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА.** — Дзякуючы сумеснай рабоце, намаганням мясцовых органаў улады, дэпутацкага корпуса, грамадскасці мы робім усё магчымае для развіцця раёна. Гэта сумесныя намаганні ўсіх жыхароў, прадпрыемстваў, арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў. Некалькі гадоў таму мы разам вызначалі тыя самыя асноўныя кірункі, якія сёння запатрабаваныя жыхарамі і апошнія прапаноўваюць свае ініцыятывы. Гэта кірункі, якія блізкія кожнаму з нас. Таму што яны звязаныя з умовамі пражывання, чыстым асяроддзем, экалогіяй, развіццём раёна. Адзін з кірункаў — развіццё турыстычнага патэнцыялу. Людзі ствараюць аграсядзібы, плануецца адкрыццё прыватнай гасцініцы. Прывіваем дзецям з ранняга ўзросту звычку да здаровага ладу жыцця, развіваць сваё асяроддзе, займацца самападрыхтоўкай. Сёння мы працуем па забеспячэнні жыхароў раёна якаснай пітной вадой. Адна станцыя абезжалезвання сёлета пабудавана, будуецца яшчэ тры. Летась з дапамогай Магілёўводаканала і аблвыканкама зроблены новыя ачышчальныя збудаванні, вырашана экалагічная праблема. Вялікая работа праводзіцца па навучэнні нашых дзяцей асновам устойлівага развіцця, самаразвіцця, пошуку шляхоў сваёй рэалізацыі. Самая галоўная каштоўнасць кожнага раёна — людзі, якія там жывуць і працуюць. Асабліва людзі, якія гараць ідэяй.

**Старшыня Магілёўскага аблсавета Аляксандр ГАРОШКІН,** які ўзяў удзел у мерапрыемстве і ў гэты ж дзень правёў прыём грамадзян у аграгарадку Ходасы Мсціслаўскага раёна, адзначыў, што апошнім часам жыхары прыходзяць не са скаргамі, а з прапановамі палепшыць жыццё ў населеным пункце. І гэта таксама прыкмета таго, што Стратэгія ўстойлівага развіцця працуе.

— Нічога без нас для нас — вось вынік гэтай работы, — адзначыў ён. — І калі ў гарадах людзі яшчэ лічаць, што ім нехта нешта павінен, то ў малых населеных пунктах адбываецца пералом. Людзі тут больш актыўна ўдзельнічаюць у паляпшэнні ўласнага месца пражывання. І гэта ідзе на карысць іх мясцовасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*Мсціслаў.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит **15 августа 2024 года в 11.00** повторный открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-72602, площадью 108,00 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – бытовое помещение, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие, ограждение железобетонное, ворота центральные, калитка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4239, площадью 644,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – Гараж с котельной, составные части и принадлежности – две пристройки, холодная пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/2;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4244, площадью 497,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – гаражи № 2, составные части и принадлежности – пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/3;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4271, площадью 19,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – автозаправочная станция, составные части и принадлежности – насыпь для емкостей, мощение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/4;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4238, площадью 60,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание стоянки дорожной техники, составные части и принадлежности – навес, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/1;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4269, площадью 11,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание КНС, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002891 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А.

Имущество по частям не продаётся.

**Суммарная начальная стоимость имущества 158 200,00 белорусских рублей без учета НДС.**

3. Информация о земельном участке.

Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

- 741000000007000161, площадью 1,1195 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3»;
- 741000000007002891, площадью 0,004 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3».

4. Дата, время и место проведения аукциона: **15.08.2024 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **09.08.2024; время: 17.00**. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

<u>На участие в аукционе к заявлению прилагаются:</u>

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 02.07.2024, на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит **15 августа 2024 года в 11.30** повторный открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена.

К отчуждению предлагается:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4236, площадью 657,3 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное наименование – административно-бытовой корпус, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие, ограждение металлическое, ограждение железобетонное, расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 741000000007002893, 741000000007002894 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278.

Суммарная начальная стоимость имущества **97 500,00 белорусских рублей без учета НДС.**

3. Информация о земельном участке.

Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

741000000007002893, площадью 0,2401 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 108 от 12.09.2019);

741000000007002894, площадью 0,0465 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 107 от 12.09.2019).

4. Дата, время и место проведения аукциона: **15.08.2024 в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; **дата: 09.08.2024; время: 17.00**.

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

<u>На участие в аукционе к заявлению прилагаются:</u>

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54 BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении предыдущего открытого аукциона по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано в газете «Звязда» 02.07.2024 и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена (без учета НДС), руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** баллоны кислородные в количестве 20 штук | 2 500,00 | 250,00 |
| **Лот № 2:** баллоны кислородные в количестве 20 штук | 2 500,00 | 250,00 |
| **Лот № 3:** баллоны кислородные в количестве 20 штук | 2 500,00 | 250,00 |
| **Лот № 4:** баллоны кислородные в количестве 20 штук | 2 500,00 | 250,00 |

**Продавец:** ОАО «Каменецкий райагросервис», 225051, г. Каменец, ул. 8 Марта, 17, тел. 80163123086. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Шаг аукциона: 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 05 сентября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 04 сентября 2024 г. до 17.00**

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | УП «Лаздуны-Агро», Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны 1, ул. Советская, д. 1. УНП 592001055 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов: бывшая в употреблении сельхозтехника.**
Месторасположение:
**Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны**

| Лот № | Марка, модель | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв. № 14987 | **9 267,74** |
| 2 | **Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв. № 14988 | **9 267,74** |
| 3 | **Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 201914989 | **9 267,74** |
| 4 | **Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв. № 14990 | **9 267,74** |
| 5 | **Комбайн кормоуборочный КВК 800-36,** 2014 г. в., инв. № 3184 | **82 292,83** |
| 6 | **Агрегат почвообрабатывающе-посевной АПП-6Д,** 2013 г. в., инв. № 3339 | **21 560,80** |
| 7 | **Захват рулонов ПМС-0,8,** 2014 г. в., инв. № 39 | **545,48** |
| 8 | **Удлинитель стрелы ПМС-0,8,** 2014 г. в., инв. № 47 | **2 902,87** |
| 9 | **Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180Б,** 2012 г. в., инв. № 2012/1 | **2 919,19** |
| 10 | **Опрыскиватель самоходный УЭСМ 010 Роса-01,** 2010 г. в., инв. № 230 | **9 572,00** |

Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота. Цена снижена на 40 %

**Условия торгов:** все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа –ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 4 % до 10 % от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1–8 – 29.05.2024, по лотам № 9, 10 – 16.04.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 14.08.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.08.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 161/С-20596 (наименование: Жилой дом; назначение: Здание одноквартирного жилого дома), площадью 46,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Волчинский с/с, д. Волчин, ул. Ленина, 52, на земельном участке с кадастровым номером 124081701601000285, площадью 0,2049 га, составные части и принадлежности: терраса, сарай с погребом, гараж, два сарая, навес, уборная

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб.** | 14 649,23 | **Размер задатка, руб.** | 1 464,92 |

**Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел. 80163172881. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 06 сентября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 05 сентября 2024 г. до 17.00**

# ЛЯЧЫЦЬ ЦІ КАРАЦЬ? ПРАФІЛАКТАВАЦЬ!

## Толькі комплексныя падыходы дзейсныя ў барацьбе з наркаспажываннем

**Нядаўна кіраўніком дзяржавы падпісаны законапраект, які прадугледжвае магчымасць аказання спецыялізаванай дапамогі дзецям, што пакутуюць ад алкагольнай ці наркатычнай залежнасці. Размова ідзе аб накіраванні іх у спецшколы па заявах бацькоў. Тэрмін знаходжання ў спецшколе можа быць ад трох месяцаў да года. Пры гэтым у любы час дзіця па заяве бацькоў можа вярнуцца дадому. Змены накіраваны на тое, каб выцягнуць падлетка з асяроддзя, дзе ён ужываў забароненыя рэчывы, і дзякуючы комплекснай рэабілітацыі даць магчымасць пазбавіцца ад залежнасці. Што датычыцца дарослых, то ў заканадаўстве таксама ёсць новаўвядзенні. У прыватнасці, цяпер наркаспажыўцы могуць быць накіраваны ў ЛПП па спрошчанай працэдуры. Пра гэтыя навелы і спосабы засцерагчы дзяцей і падлеткаў ад наркаспажывання расказалі спецыялісты.**



### Лічбы нарказлачынстваў зніжаюцца, але супакойвацца рана

Па выніках пяці месяцаў бягучага года ў нашай краіне на шэсць працэнтаў знізілася колькасць выяўленых нарказлачынстваў, на 18 працэнтаў зменшылася колькасць дастаўлення ва ўстановы аховы здароўя ў сувязі з атручэннем наркотыкамі, на 30 працэнтаў стала менш смяротных передазіровак, зафіксавана нязначнае зніжэнне колькасці нарказлачынстваў, учыненых раней судзімымі. Тым не менш супакойвацца не варта: пра наркапагрозу, якая захоўваецца, сведчыць тое, што наша краіна па-ранейшаму застаецца транзітнай дзяржавай для паставак наркотыкаў з тэрыторыі Расіі і з боку Захаду. Толькі за пяць месяцаў гэтага года праваахоўныя органы спынілі 12 каналаў пастаўкі наркотыкаў у краіну, ліквідавана дзейнасць 58 памяшканняў, спецыяльна прыстасаваных для вырошчвання раслін з утрыманнем наркотыкаў. З незаконнага абароту канфіскавана амаль 300 кг наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.

Найбольшай папулярнасцю ў наркаспажыўцоў па-ранейшаму карыстаюцца асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы мефедрон і альфа-PVP, а таксама наркатычныя сродкі раслiннага паходжання — марыхуана і гашыш.

— Самае дарагое, што ёсць, — гэта здароўе, самае бясцэннае — гэта жыццё. Таму дзеянні ўсіх зацікаўленых дзяржаўных органаў накіраваны ў першую чаргу на захаванне жыцця і здароўя грамадзян. Прынятымі мерамі мы захавалі дынаміку зніжэння колькасці смяротных атручэнняў наркотыкамі. Па выніках пяці месяцаў ад атручэння наркотыкамі загінуў 21 чалавек, для параўнання летась за пяць месяцаў было зафіксавана 30 смерцяў, — расказвае **начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр ХІЛА.**

Асноўнай прычынай смяротных перадазіровак па-ранейшаму з'яўляецца спажыванне метадону ў спалучэнні з іншымі псіхаактыўнымі рэчывамі. Калі аналізаваць партрэт загінулых, то ў большасці сваёй гэта раней судзімыя асобы старэйшыя за 30 гадоў (такіх 94 %), якія знаходзіліся пад назіраннем урачоў-псіхіятраў-нарколагаў у сувязі са спажываннем наркотыкаў, а таксама мелі шэраг іншых спадарожных захворванняў.

Больш за 90 % усіх збытаў наркотыкаў адбываецца з выкарыстаннем інтэрнэту. Супрацоўнікі аналітычнай разведкі падраздзяленняў па наркакантролі актыўна змагаюцца з гэтай з'явай і за пяць месяцаў бягучага года спынілі дзейнасць 20 інтэрнэт-магазінаў па продажы наркотыкаў.

### У спецшколу — па заяве бацькоў

У часткі прафілактыкі незаконнага абароту наркотыкаў сярод непаўналетніх праводзіцца работа інспекцыяй па справах непаўналетніх. Супрацоўнікі ўзаемадзейнічаюць з трыма катэгорыямі грамадзян. Першая з іх — педагогі, якім даводзяць актуальную інфармацыю на педагагічных нарадах, шляхам трэнінгаў. Праваахоўнікі расказваюць аб спосабах уцягвання непаўналетніх у незаконны абарот наркотыкаў, прыкметах ужывання наркотыкаў, распаўсюджвання, аб механізмах дзеянняў пры выяўленні падобных фактаў.

Некалькі месяцаў таму быў зняты прафілактычны фільм «Наркотыкі і дзеці». Ён у першую чаргу прызначаны для бацькоў. Таксама арганізуюцца трэнінгі для педагогаў, каб навучыць іх не проста ўключаць фільм на бацькоўскіх сходах, але і ўмець растлумачыць некаторыя моманты. Напрыклад, расказаць, які пах мае псіхатропнае рэчыва, як правільна камунікаваць з дзіцем, якога падазраюць у распаўсюджванні наркотыкаў або спажыванні псіхастымулятараў.

Другая катэгорыя, з якой працуюць супрацоўнікі МУС, — бацькі.

— Трыбуна правядзення нашай інфармацыйнай кампаніі — гэта, вядома, бацькоўскія сходы. Тут мы таксама даносім сваю інфармацыю, дэманструючы прафілактычны фільм, які простай мовай расказвае бацькам аб адказнасці непаўналетніх, прыкметах ужывання наркотыкаў. Але, на жаль, не ўсе бацькі наведваюць бацькоўскія сходы. Для такіх мы выкарыстоўваем так званую агрэсіўную прафілактыку: з дапамогай педагогаў распаўсюджваем інфармацыю праз сацыяльныя сеткі, куды таксама выкладваем кароценькія ролікі пра адказнасць за незаконны абарот наркотыкаў, наступствы і спосабы распаўсюджвання. Наша мэта — давесці да кожнага з бацькоў разуменне, што незаконны абарот наркотыкаў небяспечны ў першую чаргу для здароўя і жыцця саміх непаўналетніх, — адзначае **намеснік начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх ГУАПП міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Васіль ДЗЕМІДОВІЧ.**

Вядзецца работа і ў частцы заканадаўчых ініцыятыў. Перапрацаваны асноўны закон аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, які прадугледжвае шэраг кардынальных змяненняў. У прыватнасці, магчымасць аказання спецыялізаванай дапамогі дзецям, якія пакутуюць ад алкагольнай і наркатычнай залежнасці. Гэта рэалізуецца шляхам накіравання дзяцей у спецшколы па заяве бацькоў. Для такіх падлеткаў будуць арганізоўвацца мерапрыемствы комплекснай рэабілітацыі.

— Комплексная рэабілітацыя будзе ўтрымліваць медыцынскія, псіхолага-педагагічныя і адукацыйныя кампаненты. Самая галоўная мэта, якую мы імкнуліся дасягнуць, — забраць дзіця з таго звыклага асяроддзя, у якое яно было паглыбленае. Трэба адарваць яго ад сяброў, калег, таварышаў, якія зацягвалі яго ў незаконны абарот наркотыкаў. Тэрмін знаходжання ў спецшколе можа быць ад трох месяцаў да года. Пры гэтым у любы час дзіця па заяве бацькоў можа вярнуцца дадому, — праінфармаваў Васіль Дземідовіч.

Трэцяя катэгорыя, з якой у рамках прафілактыкі наркаманіі працуюць супрацоўнікі МУС, — самі дзеці. Пры гэтым банальная размова аб тым, што наркотыкі — гэта дрэнна, недастаткова эфектыўная.

— Дзеці камунікуюць са сваімі аднагодкамі, якія ім кажуць, што іх ніхто не затрымае, што ім абсалютна нічога за гэта не будзе. Таму аднаначна гутаркі неэфектыўныя. У гэтым выпадку адным з дзейсных спосабаў данясення інфармацыі з'яўляюцца круглыя сталы з удзелам людзей, якія знаходзяцца ў стойкай рэмісіі на базе ўстаноў аховы здароўя. Такія мерапрыемствы праводзяць усе супрацоўнікі органаў унутраных спраў сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі. Акрамя таго, мы праводзім стрым-семінары з тымі, хто знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі, хто даходліва тлумачыць дзецям, да чаго прыводзіць гэты злачынны шлях, а падлеткі на сваё вочы бачаць вынікі ўсіх гэтых дзеянняў. Акрамя таго, для тых, з кім праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, мы арганізуем экскурсіі ў месцы пазбаўлення волі. Праводзім і адкрытыя судовыя пасяджэнні, куды запрашаем дзяцей. Вельмі актыўна выкарыстоўваецца такая форма прафілактыкі, як абранне меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту непасрэдна падчас правядзення прафілактычных мерапрыемстваў. Акрамя таго, праводзім акцыі, флэшмобы. Апошні флэшмоб «Горад без трафарэтаў» праходзіў у Гомелі: дзеці самастойна шукалі рэкламу наркамагазінаў і паведамлялі пра гэта ў праваахоўныя органы. Нельга забываць і пра інтэрактыўныя формы работы. У нас ёсць цэнтры нагляднай прафілактыкі, цэнтры бяспекі МНС, у якіх маюцца інтэрактыўныя пляцоўкі па прафілактыцы наркаманіі з муляжамі ўнутраных органаў, што пацярпелі ад уздзеяння алкаголю і наркотыкаў, — расказаў прадстаўнік МУС.

### Дзейсныя спосабы прафілактыкі — спорт і праца

Самы дзейсны метад засцерагчы дзіця ад дрэннай кампаніі — зацікавіць яго любымі спартыўнымі секцыямі, гурткамі, а таксама забяспечыць магчымасць працаўладкавацца.

— Так, тут не атрымаецца той касмічнай заработнай платы, якую абяцаюць наркамагазіны, але мы прапануем рэальны заробак 500—700 рублёў. Дзіця зможа іх зарабіць абсалютна законна, — дадаў Васіль Дземідовіч.

Для дарослых асноўным прафілактычным метадам наркаманіі з'яўляецца накіраванне ў лячэбна-працоўны прафілакторый. У бягучым годзе ўжо 150 нарказалежных грамадзян накіраваны ў гэтыя ўстановы, больш як 300 вынесена афіцыйнае папярэджанне аб магчымасці накіравання.

Згодна з перапрацаваным законам, які датычыцца ЛПП, цяпер гэта катэгорыя грамадзян можа быць накіравана ва ўстанову па больш спрошчаным парадку. Калі паўналетні грамадзянін упершыню звярнуўся ва ўстанову аховы здароўя з передазіроўкай наркатычнымі сродкамі, ён атрымлівае афіцыйнае папярэджанне аб магчымым накіраванні ў ЛПП. Калі ж на працягу года ён ізноў туды трапляе, то праводзіцца медыцынская камісія з мэтай накіравання яго ў ЛПП, затым адпаведнае рашэнне прымае суд.

Прафілактычныя мерапрыемствы сярод дзяцей і падлеткаў праводзяцца і ва ўстановах адукацыі. Як расказала **загадчыца сектара каардынацыі і метадычнага забеспячэння прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў сярод навучэнцаў Цэнтра сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Акадэміі адукацыі Маргарыта ТОЎКЕС,** адным з крокаў па канцэнтрацыі намаганняў на прафілактыцы распаўсюджвання наркаманіі сярод непаўналетніх з'яўляецца наведванне на сістэмнай аснове антынаркатычных пляцовак — цэнтраў прафілактыкі наркаманіі, якія прысвечаны негатыўным сацыяльным і медыцынскім наступствам наркаманіі, а таксама барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў. З 2023 года іх наведалі больш як 20 тысяч навучэнцаў. Немалая частка з іх — малодшыя школьнікі. Акрамя таго, на класных, інфармацыйных гадзінах разглядаюцца тэмы па прафілактыцы ў адпаведнасці з узростам дзяцей. Акцэнт пры гэтым ставіцца на ўменне сказаць «не».

### Самая складаная з залежнасцяў

Як вядома, прафілактаваць залежнасць нашмат прасцей, чым ад яе пазбавіцца. Як адзначае **ўрач-псіхіятр-нарколаг, загадчык 18-га наркалагічнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Сяргей МАРЧУК,** наркатычная залежнасць з'яўляецца адной з самых складаных.

— Асобы з наркатычнай залежнасцю, як правіла, маюць нізкі ўзровень матывацыі на збаўленне ад захворвання і прывядзенне яго ў стан рэмісіі і кантролю. Яшчэ адзін важны момант — пры гэтым захворванні больш, чым пры іншых, уплывае знешняе асяроддзе. Нізкая матывацыя і высокі ўплыў асяроддзя з'яўляюцца тымі фактарамі, якія абцяжарваюць работу ўрачоў, — падкрэслівае Сяргей Марчук.

Лячэнне нарказалежных базіруецца не толькі на медыцынскім кампаненце, але і на сацыяльным і рэабілітацыйным. Шырока развіваюцца новыя формы медыцынскай і рэабілітацыйнай дапамогі.

— Папярэднія формы медыкаментознай дапамогі, лячэння ў межах закрытых наркалагічных, псіхіятрычных аддзяленняў давалі выражаны фізічны эфект для пацыентаў, але гэта не мяняла сацыяльнага кампанента захворвання. Яны паляпшалі якасць жыцця неадкладна, але, вяртаючыся ў ранейшае асяроддзе, аднаўлялі ўжыванне, — кажа ўрач.

Сярод сучасных тэндэнцый дапамогі пацыентам з наркатычнай залежнасцю — прагарама апіёіднай замяшчальнай тэрапіі, якая цяпер шырока распаўсюджана. У краіне 21 кабінет замяшчальнай тэрапіі.

— У пацыентаў з наркатычнай залежнасцю заўсёды ёсць альтэрнатыва: замест таго каб ужываць наркатычныя рэчывы вулічнага паходжання і мець шэраг праблем псіхічнай і саматычнай якасці, крымінальныя наступствы, ёсць магчымасць пад кантролем урачоў-псіхіятраў-нарколагаў ужываць бяспечнае наркатычнае рэчыва. Гэта ў значнай ступені змяншае верагоднасць учынення крымінальных правапарушэнняў. Людзі на апіёіднай замяшчальнай тэрапіі пастаянна знаходзяцца пад назіраннем урачоў-псіхіятраў-нарколагаў, маюць пастаянны доступ да медыцынскай дапамогі, рэгулярна здаюць аналізы, каб пацвярджаць сваю цвярозасць ад наркатычных сродкаў вулічнага паходжання, атрымліваюць антырэтравірусную тэрапію, што ў значнай ступені паляпшае якасць жыцця пацыентаў, якія маюць ВІЧ-інфекцыю. Праграма замяшчальнай тэрапіі дапамагае сацыялізавацца. Гэта працаўладкаваныя асобы, якія сябе рэалізуюць як паўнацэнныя грамадзяне. Яны аднаўляюць сем'і, нараджаюць дзяцей, што сацыяльна паляпшае іх якасць жыцця, — расказвае Сяргей Марчук.

Другі важны пласт сучаснай работы з нарказалежнымі — пераход на новы фармат і праграму даўгачаснай рэабілітацыі. З 2019 года такая створана на базе 18-га аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя. Эксперыментальная праграма даўгачасная, гэта значыць, пацыенты могуць быць пад назіраннем урачоў і пад пастаяннай рэабілітацыйнай работай са спецыялістамі цягам 1,5 года пасля выпіскі са стацыянара. Комплексны падыход прадугледжвае не толькі рэабілітацыю, але і аказанне медыцынскай дапамогі ад моманту дэтаксікацыі, стацыянарную рэабілітацыю цягам 28-30 дзён ва ўмовах закрытага наркалагічнага аддзялення, дзе ёсць магчымасць штодзённа наведваць групавую тэрапію, 2-3 разы на тыдзень індывідуальна працаваць з псіхолагам і псіхатэрапеўтам, пастаянна прымаць падтрымлівальную лекавую тэрапію. Цягам 1,5 года пасля выпіскі са стацыянара пацыенты могуць рэгулярна наведваць рэабілітацыйныя мерапрыемствы, у прыватнасці групавую і індывідуальную псіхатэрапію, атрымліваць кансультацыю ўрача-псіхіятра-нарколага.

Пад комплексным падыходам разумеецца і сацыяльны кампанент — дапамога ў аднаўленні дакументаў, сацыялізацыя, суправаджэнне ў пошуку работы, у выніку чаго пацыент не адчувае сябе кінутым. У 2023-м на базе 18-га аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя каля 145 чалавек прайшлі этапы дэтаксікацыі і стацыянарнай рэабілітацыі і на сёння атрымліваюць дапамогу на амбулаторным этапе.

**Алена КРАВЕЦ.**

Ёсць пытанне

# «ТРЫ КІТЫ» ХАРЧАВАННЯ

## Соль, цукар, тлушч — ці варта іх апасацца

**Ці задумваліся вы, што каля паловы, а нярэдка і 70 % таго, што мы з'ядаем у суткі, прыгатавана не намі. І часта мы дакладна не ведаем, што ў складзе гэтых страў. Харчовая прамысловасць гатова накарміць нас у любы час дня і ночы: смачна, сытна, дастаткова танна. Але праўда ў тым, што «тры кіты», на якіх стаіць вытворчасць гатовай ежы і прадуктаў харчавання ў любой краіне свету, — соль, цукар і тлушч. І гэта тыя рэчывы, якія ў сучасным свеце прынята «дэманізаваць», лічачы іх безумоўным злом для нашага здароўя. Ці так гэта і як з гэтым жыць, мы вырашылі спытаць у дыетолага.**



Цукар — наркотык.

### У абарону солі

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **28.08.2024 11.00** | Продажа квартиры с инв. номером 500/D-264342, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, д. 18, кв. 125 | 54900 | 54,7 кв. м | 10 | 90 |
| **28.08.2024 12.00** | Аренда квартиры с инв. номером 100-102-442-41-2-28, по адресу: г. Минск, ул. Денисовская, д. 41, корп. 2, кв. 28 | 320 | 47,4 кв. м | 10 | 10 |
| **Изменение условий по объекту торгов** | | | | | |
| **22.08.2024 11:00** | Продажа участка с кадастровым номером 623681313601000011, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Микулино | 10000 | 0,1397 га | 10 | 90 |
| **22.08.2024 12.00** | Продажа участка с кадастровым номером 623681313601000012, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Микулино | 17000 | 0,1371 га | 10 | 90 |
| **Повторные конкурсные торги** | | | | | |
| **28.08.2024 13.00** | Продажа жилого дома. с инв. № 600/С-58737, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, д. Дегтярёвка, ул. Молодежная, д. 14 | 40000 | 43,6 кв. м | 10 | 90 |
| **28.08.2024 14.00** | Продажа квартиры с инв. № 615/D-8286, по адресу: Минская область, Червенский район, Валевачский с/с, д. Гребёнка, пер. Первый, д. 5, кв. 5 | 8000 | 67,0 кв. м | 10 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск. ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж.

Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращается за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю.

Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденными приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.

Телефон для справок (+37529)171-50-50.

УНП 193734126

Отчет эмитента ценных бумаг за январь–июнь 2024 года

# ООО «Темпл Сити»

220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260
Вид экономической деятельности: сдача внаем собственного и арендуемого имущества. Единица измерения: тыс. руб.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2024 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 30 июня 2024 года | На 31 декабря 2023 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 10 648 | 10 746 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 14 | 14 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 9 | 9 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **10 671** | **10 769** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 14 | 14 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 14 | 14 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 126 | 131 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 22 | 22 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 218 | 154 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **380** | **321** |
| **БАЛАНС** | **300** | **11 051** | **11 090** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 30 июня 2024 года | На 31 декабря 2023 года |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 874 | 1 874 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 3 840 | 3 840 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (1 100) | (1 100) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | 150 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **4 764** | **4 614** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 5 059 | 5 308 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 334 | 334 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **5 393** | **5 642** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 713 | 731 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 81 | 103 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 17 | 39 |
| по авансам полученным | 632 | 8 | 6 |
| по налогам и сборам | 633 | 18 | 18 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | - | - |
| по оплате труда | 635 | 1 | 1 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 37 | 39 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **894** | **834** |
| **БАЛАНС** | **700** | **11 051** | **11 090** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–июнь 2024 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–июнь 2024 года | За январь–июнь 2023 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 476 | 425 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (241) | - |
| Валовая прибыль | 030 | 235 | 425 |
| Управленческие расходы | 040 | (50) | (274) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 185 | 151 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 193 | 403 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (200) | (414) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 178 | 140 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | - |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | - |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 253 | 194 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 252 | 194 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 1 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (281) | (376) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (166) | (142) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (113) | (232) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (2) | (2) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (28) | (182) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 150 | (42) |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 150 | (42) |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 150 | (42) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Навуковы падыход

# Пяты фронт, цытадэлі мужнасці, сатыра пераможцаў

## Якія новыя тэмы і пытанні ўзняты сучаснымі даследчыкамі

**У нашай краіне робіцца вельмі шмат для захавання памяці аб тых, хто змагаўся і загінуў на беларускай зямлі ў Вялікую Айчынную вайну. Пабудавана больш як восем тысяч помнікаў і мемарыялаў, насыпана 180 курганоў памяці. Беларускія вучоныя надрукавалі каля 12 тысяч навуковых прац. На гэта звярнуў увагу акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ падчас міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: гісторыя і сучаснасць», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі. Яе праводзіла Нацыянальная акадэмія навук сумесна з міністэрствамі абароны і адукацыі, грамадскімі арганізацыямі. У форуме ўзялі ўдзел больш за 400 чалавек.**

У Беларусі створана ўнікальная хроніка «Памяць», якая налічвае паўтары сотні тамоў, а таксама адзіны на постсавецкай прасторы вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны». За апошнія гады пабачылі свет такія выданні, як «Унёсак беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне», «Сузор'е герояў зямлі беларускай», «Твае сыны, Беларусь» і многія іншыя. Ініцыіравана ўсенародная акцыя «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны. Успомнім усіх». Яна падтрымана выканаўчымі органамі ўлады, установамі адукацыі і культуры, грамадскімі арганізацыямі. Штогод, пачынаючы з 2020-га, выходзяць кнігі, у якіх друкуюцца ўспаміны ўдзельнікаў, сямейныя хронікі, артыкулы, фатаграфіі, дакументы. Тут размяшчаецца інфармацыя пра франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, якія змагаліся на тэрыторыі Беларусі. За чатыры гады, што дзейнічае акцыя, надрукаваны матэрыялы, прадстаўленыя вучонымі, выкладчыкамі, настаўнікамі, школьнікамі. Ужо размешчана 246 публікацый. Падрыхтавана да друку чацвёртая кніга, і праца працягваецца. Тым не менш з кожным годам даследчыкі ўздымаюць новыя тэмы, а пытанняў, звязаных з вывучэннем ваеннай гісторыі, перадачай гістарычнай праўды, не становіцца менш. Некаторыя з іх былі ўзняты падчас канферэнцыі.

### ЦІ З'ЯВІЦЦА ПЯТЫ ШТЫК?

З прапановай больш увагі аддаць подзвігу беларускіх партызан выступіў **загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Аляксей ЛІТВІН**. Ён згадаў лета 1969 года, калі ў 25-гадовы юбілей аперацыі «Баграціён» урачыста адкрыўся Курган Славы, які насыпаўся рукамі дзесяткаў тысяч чалавек, у тым ліку і студэнтаў-гісторыкаў.

— У той час ад свайго выкладчыка, былога партызана, я пачуў шкадаванне, што помніку не хапае аднаго штыка.

Глыбокае разуменне гэтых слоў, як прызнаўся вучоны, прыйшло пазней. Чатыры абеліскі ў форме штыкоў на Кургане Славы сімвалізуюць чатыры франты, якія вызвалялі Беларусь летам 1944 года. Але нельга недаацэньваць ролю, якую адыгралі ў вызваленні партызаны. Тым больш што тэрміны «пяты фронт», «партызанскі фронт», «фронт у тыле ворага» ўжо даўно шырока выкарыстоўваюцца ў навуковай і мастацкай літаратурах.

Да сярэдзіны красавіка 1944 года завяршыўся першы этап вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

— Важна разумець, што адбывалася на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Да гэтага часу праціўнік быў выбіты з 36 раёнаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей. З кастрычніка 1943-га па красавік 1944 года з часцямі Чырвонай Арміі злучыліся больш як 35 партызанскіх брыгад і 15 асобных партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю больш чым 50 тысяч чалавек. Але на акупаванай тэрыторыі працягвала дзейнічаць вялікая армія беларускіх партызан. Пацвярджэннем гэтаму стала цудоўна праведзеная стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён». У шчыльным узаемадзеянні з наступальнымі часцямі Чырвонай Арміі сваю зямлю вызвалялі беларускі народ у складзе пятага фронту, партызанскага, — заўважыў вучоны.

Калі савецкія войскі актыўна рыхтаваліся да вырашальнай бітвы, для партызан гэта быў час, калі яны змагаліся за выжыванне. Выкарыстоўваючы аператыўную паўзу, гітлераўскае кіраўніцтва імкнулася ўсімі сіламі ачысціць ад партызан не толькі прыфрантавую тэрыторыю, але і разграміць асноўныя партызанскія зоны і ў цэлым ліквідаваць партызанскі рух. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі праводзіліся карныя аперацыі ажно да канца чэрвеня 1944 года. Акрамя спецыяльных сіл, да іх былі прыцягнуты злучэнні і часці вермахта, паліцэйскія фарміраванні Літвы, Латвіі, мясцовая паліцыя, а таксама асобныя фарміраванні беларускай краявой абароны. У красавіку—чэрвені 1944 года карныя аперацыі па вынішчэнні партызан з прыфрантавой паласы праводзіліся на тэрыторыі паўночных раёнаў Мінскай, Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей. Калі ў студзені ў карных аперацыях з нямецкага боку было задзейнічана каля 30 тысяч чалавек, дык у сакавіку ўжо 60 тысяч, у красавіку 80, у маі да ста тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Самая маштабная за гады вайны экспедыцыя (аперацыя «Фрулінгсфест») прайшла з 11 красавіка па 9 мая 1944 года супраць партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. 60 тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў, франтавыя дывізіі, ахоўныя войскі, войскі СС удзельнічалі ў ёй. І гэта супраць 17 тысяч партызан. Па даных Беларускага штаба партызанскага руху, немцы страцілі ў гэтай аперацыі да 20 тысяч салдат і афіцэраў, 50 танкаў, 116 аўтамабіляў, сем бронемашын, 22 гарматы, два самалёты.

Карныя аперацыі працягваліся да 23 чэрвеня, калі Чырвоная Армія перайшла ў наступленне. Усяго са студзеня да канца чэрвеня было праведзена 30 буйных карных аперацый. Акрамя абароны, партызаны Беларусі вялі пастаянныя баявыя дзеянні супраць гарнізонаў праціўніка. За гэты час было разгромлена 150 варожых гарнізонаў, вяліся дыверсіі на камунікацыях. Са студзеня да чэрвеня было здзейснена 3730 аперацый. А яшчэ партызаны бралі ўдзел у пасяўной кампаніі, абароне партызанскіх зон. Адной з найважнейшых задач быў і збор разведвальнай інфармацыі для Чырвонай Арміі. Амаль уся тэрыторыя Беларусі была пакрыта партызанскімі зонамі і фарміраваннямі. Да пачатку аперацыі «Баграціён» на тэрыторыі Беларусі знаходзілася 150 партызанскіх брыгад і 49 асобна дзеючых атрадаў, якія налічвалі больш за 140 тысяч чалавек. Гэта ўлічыла савецкае камандаванне пры распрацоўцы аперацыі «Баграціён». Да пачатку яе была аказана вялікая дапамога савецкага тылу. Было выкінута 7832 тоны баявых грузаў, што ў 2,5 раза больш, чым за пяць апошніх месяцаў 1943 года. Партызаны атрымалі 49 тон толу, 3600 вінтовак, звыш 26 тон медыкаментаў.

Напярэдадні аперацыі партызанскія сілы раслі. Да 23 чэрвеня колькасць партызан павялічылася на 65 тысяч. 8 чэрвеня партызаны атрымалі канкрэтную дырэктыву Беларускага штаба партызанскага руху на правядзенне «Рэйкавай вайны». Галоўная задача, якая ставілася перад імі, — захоп і ўтрыманне пераправаў, дапамога насельніцтву ва ўзвядзенні перапраў і гацяў у цяжкадаступных месцах. Партызаны аказвалі дапамогу ў фарсіраванні рэк Пціч, Бярэзіна, Случ, Друць, Арэса, Шчара, Нёман. Падчас наступлення яны захапілі, ачысцілі ад ворагаў і ўтрымлівалі да прыходу Чырвонай Арміі многія райцэнтры і чыгуначныя станцыі. Удзельнічалі ў вызваленні Мінска і трох абласных цэнтраў, больш як 40 буйных населеных пунктаў Беларусі. Даследчыкам яшчэ трэба падлічыць, якія страты панеслі партызаны падчас вызвалення Беларусі. Так, вядома, што на самым вялікім па колькасці — Першым беларускім фронце, які налічваў 1 071 100 чалавек, — страты былі каля 66 тысяч. На Другім Беларускім фронце, які налічваў 319 500 чалавек, падчас аперацыі загінула звыш 26 тысяч. Партызанскі фронт (калі ўлічваць няўзброены рэзерв і падтрымку насельніцтва) таксама меў вялікія страты, гэта магло быць каля 20 тысяч чалавек.

— На вяршыні Кургана Славы неабходны яшчэ адзін штык як сімвал існавання пятага фронту. Я не настойваю на рэканструкцыі. Важна, каб гэта было ў свядомасці кожнага школьніка. Каб на пытанне «Колькі франтоў вызвалялі Беларусь?» ён адказваў, што пяць. Я спадзяюся, у нашай краіне з'явіцца помнік, варты подзвігу партызанскага фронту, — заўважыў Аляксей Літвін.



### ПАМЯЦЬ ДЗЕЛЯ ГОНАРУ

**Дацэнт кафедры гуманітарных навук Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта, кандыдат гуманітарных навук Сяргей ВАСОВІЧ** узняў пытанне: якіх крытэрыяў трэба прытрымлівацца пры ўзнагароджанні населеных пунктаў вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны»? Такі знак быў прыняты загадам Прэзідэнта ў 2004 годзе. Сёлета да 80-годдзя вызвалення падобным чынам былі адзначаны дзевяць населеных пунктаў, усяго ж іх ужо 36.

Самым першым населеным пунктам, якому ўручылі памятны вымпел, быў Брэст — у жніўні 2009-га.

Сяргей Міхайлавіч упэўнены, што горад сапраўды заслужыў такое званне. На жаль, сёння мала хто ведае, што акрамя Брэсцкай крэпасці ў пачатку вайны тут былі і іншыя месцы супраціўлення. Цэлы тыдзень змагаліся чыгуначнікі, міліцыянеры, а таксама чырвонаармейцы, якіх вайна на той час заспела на вакзале. Яны стралялі па пероне і перашкаджалі немцам скарыстацца чыгункай. Захопнікам удалося выцесніць абаронцаў у падвалы. Там іх сталі затапляць вадой. Абаронцы спрабавалі вырвацца і схавацца сярод рабочых. Але іх адразу вылічылі па знешнім выглядзе — схуднелых, са скурай, зморшчанай ад доўгага знаходжання ў вадзе.

Яшчэ адзін населены пункт Брэсцкай вобласці, адзначаны вымпелам, — Пінск. Афіцыйна лічыцца, што тут быў створаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны першы на тэрыторыі Савецкага Саюза партызанскі атрад, хоць краязнаўцы іншых населеных пунктаў спрабуюць аспрэчыць званне «першага». Падчас канферэнцыі разгарнулася дыскусія, ці настолькі істотна вызначаць, хто быў першым ці ў які дакладна час прагучаў залп гарматы, бо падобныя ўдакладненні адбіраюць у вучоных вялікую колькасць часу. Некаторыя дэталі могуць быць незаўважнымі ў маштабах краіны, але яны важныя для кожнага канкрэтнага населенага пункта, для патрыятычнага выхавання, бо любоў да малой радзімы можна прывіваць, калі ёсць чым ганарыцца. Сяргей Васовіч упэўнены, што для кожнага населенага пункта важна знайсці свой брэнд, адметныя старонкі гісторыі, асоб. Як, напрыклад, абарона таго ж вакзала ў Брэсце, першы партызанскі бой пад Пінскам ці подзвіг падлетка, які завёў акупантаў у балота.

### ГУМАР ЯК ЗБРОЯ

Некалькі дакладаў падчас пасяджэння першай секцыі былі прысвечаны выданням часоў вайны, сярод якіх рукапісныя часопісы беларускіх партызан, баявыя лісткі, што выходзілі ў тыле. **Намеснік дырэктара Дзяржархіва Віцебскай вобласці Таццяна БУЕВІЧ** паведаміла, што ва ўстанове ў асабістым архіве мастака Сямёна Далматава, франтавіка, танкіста, захоўваюцца копіі карыкатур ваеннага часу. Архівісты ўжо рабілі выстаўкі па гэтых работах, знаёмілі з імі дзяцей. Таццяна Буевіч расказала, як гумар і сатыра выкарыстоўваліся ў якасці інфармацыйнай зброі:

— Ёсць выраз, што ўпэўненасць у перамозе — 50 працэнтаў перамогі. Асабліва востра барацьба за розумы і эмоцыі людзей стаяла ў 1941—1942 гадах. Карыкатура, нягледзячы на сваю прастату, — вельмі сур'ёзнае мастацтва, якое заклікана ненавязліва ствараць эмацыянальны фон у чалавека, прыбраць негатыў. У той час яна набірала абароты.

Узнікалі новыя выданні, подпісы да малюнкаў маглі рабіць не толькі мастакі, але і паэты. Тут падбіраліся цікавыя вобразы. Напрыклад, праз малюнак падаваліся паралелі паміж Гітлерам і Напалеонам, у складаны час людзям нагадвалі пра непазбежнае паражэнне ворага. Папулярнымі былі серыі малюнкаў, падобныя на коміксы. Там маглі быць выкарыстаны вобразы як акупантаў, так і чырвонаармейцаў, якія знаходзілі выйсце ў складаных сітуацыях. Адзін з такіх герояў ваенных савецкіх «коміксаў» — Фядот Снаройкін, па меркаванні некаторых даследчыкаў, стаў правобразам славутага героя А. Твардоўскага Васіля Цёркіна. На канферэнцыі было ўзнята пытанне аб стварэнні выдання, дзе б маглі быць пададзены такія карыкатуры.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ СТАРОГА ЛЯМУСА

## У Гродне рыхтуецца экспазіцыя ў самай старажытнай драўлянай пабудове Беларусі

**Сёлета лямус Брыгіцкага манастыра адзначыць 225 гадоў. Гэта наогул унікальны аб'ект, адзіны свайго роду ў Беларусі. Дакладна вядома, што ён пабудаваны без адзінага цвіка. І ўсё ж падчас рэканструкцыі іх было выцягнута каля 12 кілаграмаў. Але час пакінуў не толькі цвікі. За гады існавання было шмат перабудоў, перагародак, змяняліся памеры вокнаў, выразаліся дзверы, рабіліся печкі. Кажуць, што апошнія жыхары сышлі адсюль толькі ў 80-х гадах мінулага стагоддзя. Цяпер будынак даводзіцца да аўтэнтычнага стану.**

Трэба сказаць, што актыўная фаза рэканструкцыі пачалася шэсць гадоў таму. Каб захаваць аб'ект ад разбурэння, быў складзены даволі смелы праект, згодна з якім будынак нават падымалі дамкратам, каб выраўняць сцены. Па словах **кіраўніка праекта рамонтных работ, навуковага супрацоўніка Гродзенскага інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Алены ШЧАСНАЙ**, гэта быў самы адказны момант. Трэба было зрабіць шмат разлікаў, каб ён не склаўся, як картачны домік. Пакуль дом вісеў, замянілі вянцы, якія прагнілі, і ўмацавалі фундамент. Потым паставілі будынак на месца. Сцены ачышчалі ўручную, затым насыцілі спецыяльным растворам ад шкоднікаў — іх сляды добра бачны на дрэве.

З'явіўся новы дах з гонты — пласцінкі зроблены з асінавага дрэва, якое праз некалькі гадоў змяніла колер і наблізілася да былога выгляду.

Што датычыцца перыяду пабудовы, ёсць некалькі варыянтаў. Некаторыя называюць 1634 год, калі ў горад прыехалі першыя сёстры-брыгіткі. Але больш дакладным лічыцца канец XVII стагоддзя. Такім чынам, аб'екту сёлета спаўняецца 225 гадоў. У сувязі з гэтым тут рыхтуецца экспазіцыя ў адпаведнасці з яго прызначэннем. Лямус — нямецкае слова і азначае гаспадарчую пабудову. Такой яна і была ў той час. Тут захоўвалі прадукты, агародніну, прылады працы. Але не толькі. На другім паверсе жыў капелан — духоўнік сясцёр.

Як расказаў **настаяцель Брыгіцкага касцёла Антоній ГРЭМЗА**, пакуль будзе дзейнічаць толькі першы паверх. Экспанаты размясціліся ў двух пакоях. Збіраліся яны даўно, некаторыя вельмі старажытныя. Знаходзіліся разрознена, і цяпер з'явілася магчымасць іх упарадкаваць і прадставіць на агляд турыстам.



Трэба сказаць, што інтарэс да драўлянага аб'екта, які пабудаваны без адзінага цвіка і нейкім цудам стаіць больш як 200 гадоў, даволі вялікі. Гэта самы старажытны драўляны будынак Беларусі, ён знаходзіцца на тэрыторыі Брыгіцкага манастыра, і доўгі час сюды не было доступу з вуліцы. Цяпер праход дазволены, і сюды пастаянна ідуць турысты, у тым ліку і самі гродзенцы, многія з якіх нават не ведалі аб існаванні такога ўнікальнага аб'екта.

Магчыма, такая абмежаванасць і дазволіла захаваць будынак да гэтай пары. Да таго ж доўгі час тут знаходзіўся псіханеўралагічны дыспансер. Зразумела, што экскурсіі сюды ніхто не вадзіў. І толькі пасля звароту гродзенскіх гісторыкаў пачаўся этап рэнесансу. Гадоў 20 таму лямус быў перададзены каталіцкай епархіі. Антоній Грэмза заўважае, што ахвотных паглядзець на старажытны будынак даволі шмат, таму вырашылі адкрыць доступ не толькі звонку, але і ўнутры. А каб турыстам было цікава, напоўнілі пакоі бытавымі экспанатамі, якія тут маглі быць у старажытнасці.

Увогуле, здаецца, што гэтыя сцены многае тояць: за два стагоддзі адбылося шмат падзей. Горад і гарэў не аднойчы, і вайна не адна праз яго прайшла, а драўляны будынак выстаяў. Каб яго захаваць, вядуцца вельмі скрупулёзныя работы. І хоць першапачаткова ён будаваўся без металічных элементаў, падчас рэканструкцыі не ўдалося ад іх адмовіцца. Для трываласці такія элементы прымяняліся.

Па словах Алены Шчаснай, у ходзе работ у праект уносіліся змяненні. Напачатку планавалася падвесці камунікацыі і зрабіць ацяпленне, але потым ад гэтага адмовіліся, каб не пашкодзіць сцены, толькі правялі электрыку. Пакуль зроблена адно крыло.

Драўляны аб'ект патрабуе пастаяннага догляду, перыядычнага рамонту, ужо пяць гадоў прайшло пасля завяршэння папярэдніх работ, нагадала Алена Шчасная. І хоць увесь стары брус ніжняй часткі будынка замянілі, невядома, якія яшчэ праявы могуць вылезці наверх.

Увогуле, лямус — гэта адзін з этапаў добраўпарадкавання Брыгіцкага комплексу, які быў пабудаваны ў XVII стагоддзі і займаў цэлы гарадскі квартал. У склад яго ўваходзілі касцёл, манастыр і драўляны лямус з высокай каменнай агароджай з брамамі. Адна такая брама захавалася і чакае рамонту. Таксама не вырашана пытанне ліўнёўкі, некаторых іншых інжынерных камунікацый. Таму наперадзе яшчэ нямала будаўнічых работ.

Трэба сказаць, што нядаўна ў храме была створана экспазіцыя з фондаў манастыра. У адрамантаванай галерэі размясцілі карціны, прадметы, якія датычыліся жыцця сёстраў-брыгітак і захоўваліся ў падвалах. А цяпер будзе дзейнічаць экспазіцыя і ў драўляным лямусе. Між тым аб'ект каштоўны і сам па сабе. Нездарма яму прысвоена катэгорыя «0». Будынак з'яўляецца аб'ектам культурнай спадчыны Беларусі.

Дарэчы, у Гродне ёсць яшчэ і цагляны лямус, які захаваўся з часоў Антонія Тызенгаўза — віцэ-адміністратара горада. Ён уваходзіць у старажытны комплекс «Гарадніца» і на плане горада 1823 года пазначаны як «цагляная крама пры канюшні». Доўгі час будынак пуставаў. Цяпер тут месціцца рэстаран, які так і называецца «Стары лямус».

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# У абдымках вішнёвай каралевы

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Арганізатары свята «Вішнёвы фестываль» аддаюць вялікую ўвагу развіццю фізічнай культуры і спорту, прапагандзе здаровага ладу жыцця, таму ў праграме мерапрыемства заўсёды значыцца нямала займальных спартыўных спаборніцтваў. Адным з першых тэматычных турніраў стала адкрытае першынства Глыбоцкай ДЮСШ па пляжным валейболе сярод дзяўчынак і хлопчыкаў 2013—2014 гадоў нараджэння «Вішня над сеткай».

Глыбоцкі цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці ў першы дзень фестывалю запрашаў усіх ахвотных на выставу кітайскіх вееraў. На ёй прэзентавалі больш як 60 веераў, што дазволіла глыбачанам і гасцям горада пазнаёміцца з модай і культурай, традыцыямі і звычаямі кітайскага народа. Па словах куратара выставы Цынь Лінлінь, для яе гэта не першае знаёмства з горадам Глыбокае. Прадстаўніца КНР была на фестывалі ў 2022 годзе. Сёлета з сябрамі Цынь прывезла на Віцебшчыну адзін з галоўных сімвалаў кітайскай культуры, выстава прыемна ўразіла глыбачан і гасцей.

Традыцыйна гасцей у свае рэзідэнцыі сустракала вішнёвая каралева — галоўная гераіня міжнароднага свята. Пазнаёміцца з ёй прыйшло шмат гасцей: мясцовыя жыхары, прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый горада, палачане, віцябчане, мінчане, жыхары Санкт-Пецярбурга, горада Тарапец Цвярской вобласці, расіяне, якія адпачываюць у санаторна-курортным комплексе «Пліса». Іх усіх каралева вітала з памочніцамі-вішанькамі і казачнымі вартавымі парадку. У рэзідэнцыі прайшлі майстар-класы, канцэрт, а яшчэ ўсе змаглі паспрабаваць прысмакі з сімвалам фестывалю.



Яркую музычную сустрэчу каля скульптуры глыбоцкай вішні на вуліцы Леніна арганізавалі супрацоўнікі Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў. Ганаровымі гасцямі мерапрыемства, якое прайшло сёлета ўпершыню, былі маладыя пары — Антона і Ульяны Жукоў, Аляксандра і Таццяны Вышадкаў, якія заключылі шлюбы падчас правядзення «Вішнёвага фестывалю» ў Глыбокім. Антон і Ульяна сталі мужам і жонкай у мінулым годзе, а на сёлетнюю сустрэчу каля скульптуры прыйшлі не ўдваіх, а ўтраіх з маленькай «вішанькай», дачушкай Ганнай. На сямейным рахунку Аляксандра і Таццяны пяць сумесна пражытых гадоў. Маладыя бацькі выхоўваюць дачку Дарыну.

Глыбоцкая «вішня» стала і месцам творчых сустрэч: тут віталі калектывы з Полацка і расійскага горада Востраў, ансамбль рускай песні «Забавушка» са Смаленска, студыю танцаў «Каўказ» і ансамбль азербайджанскага танца «Сары Гялін», творчыя калектывы «Суседзі» і «Талачынскія закаблукі». Як прызналіся госці, яны ў захапленні ад Глыбокага, ад душэўных, гасцінных сустрэч, ад новых знаёмстваў і яркіх уражанняў.

Па традыцыі ў першы фестывальны вечар на цэнтральнай плошчы ў Глыбокім прайшла этнавечарына з удзелам творчых калектываў з розных краін, а на захадзе сонца ўсіх удзельнікаў запрасілі на вогненнае шоу.

Другі фестывальны дзень быў насычаны яркімі падзеямі. Вішнёвую каралеву ўдзельнікі і госці міжнароднага свята сустракалі каля скульптурнай кампазіцыі «Глыбоцкая вішня». У першыя гады правядзення мерапрыемства галоўная гераіня прыязджала на карэце, запрэжанай чацвёркай коней. Ужо на мінулым фестывалі каралеву на свята прывёз лімузін, сёлета — кабрыялет.

27 ліпеня адбылася прэзентацыя конкурсу «Вішапка», які праводзіўся ўпершыню. Яго ўдзельнікі павінны былі прыдумаць тэматычныя галаўныя ўборы, і гэта, дарэчы, у іх здорава атрымалася. Асабліва ўразіў публіку какошнік неверагодных памераў, які з двух бакоў трымалі на палках.

Цэнтральнай падзеяй фестывалю з году ў год з'яўляецца ўрачыстае шэсце ўдзельнікаў і гасцей ад скульптурнай кампазіцыі да канцэртнай пляцоўкі на беразе возера Кагальнае. Сёлета ў Глыбокае завіталі ганаровыя госці, якія таксама далучыліся да шэсця: першы намеснік Генеральнага сакратара СНД Леанід Анфімаў; намеснік Генеральнага сакратара СНД Нурлан Сейцімаў; саветнік Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксей Галузін; Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сербіі ў Рэспубліцы Беларусь Іліна Вукайловіч; намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў, а таксама госці з суседніх раёнаў і многія іншыя.

Упрыгажэннем дванаццатага міжнароднага свята «Вішнёвы фестываль» стала тэматычнае вяселле. У такі яркі летні маляўнічы дзень пажадалі зарэгістраваць свой шлюб жыхарка Докшыцкага раёна Анжаліка Навуменка і палачанін Уладзіслаў Марушчак. Са стварэннем новай сям'і маладых віталі кіраўніцтва горада, прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый.

Не абышлося без традыцыйнага конкурсу гарманістаў і баяністаў «Вішнёвыя найгрышы». Пасля яго ўсім прысутным прапанавалі паспрабаваць на смак дзясяткі відаў вішнёвага варэння і паўдзельнічаць у аўкцыёне «Вішнёвы ПІРог». Упершыню на фестывалі правялі забег вінаградных слімакоў, у якім узялі ўдзел каля трох дзясяткаў малюскаў. Святочным акордам дванаццатага фестывалю на Глыбоччыне стаў яркі феерверк.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота**
**ТК «Глыбоцкі раён. Афіцыйна».**

# Правила проведения рекламной игры «ПАЧКА НА ПРОКАЧКУ»

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Пачка на прокачку» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующие значения.

**Участник** – физическое лицо, которое выполнило требования, необходимые для участия в рекламной игре «Пачка на прокачку» (далее – Рекламная игра, Игра).

**Игровой код** – шестизначное число, которое присваивается участнику при соблюдении правил участия в Рекламной игре.

**Розыгрыш** – розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной Игры.

**Интернет-сайт** – сайт promo.repacklays.by.

**Персональные данные** – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо заполнить при регистрации на Интернет-сайте, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если таковое имеется);
- дата рождения (обязательно);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи в международном формате (обязательно).

**Игровой продукт** – снеки Lay's (кроме Lay's STAX), Cheetos и Хрусteam.

**Центр выдачи призов (ЦВП)** – стационарные пункты выдачи призов, расположенные в торговых сетях и торговых центрах, согласно адресной программе настоящих Правил.

**Скретч-карта** – уникальный бумажный носитель со стираемым полем с защитным покрытием, который выдается участнику в ЦВП при соблюдении правил участия в Рекламной игре, и под защитным покрытием содержит информацию с уникальным буквенно-цифровым кодом.

**Промоутер** – работник, который занимается выдачей скретч-карт, призов и консультирует участников по Правилам Рекламной игры.

**Уникальный буквенно-цифровой код** – восьмизначный код, состоящий из цифр от 0 до 9 и букв латинского алфавита.

**Интернет-сайт** – сайт promo.repacklays.by.

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры (далее – Организатор) является общество с ограниченной ответственностью «Оджей групп», пр. Машерова, д. 15, корп. 1, каб. 2, г. Минск, Республика Беларусь, 220029, УНП 192479466, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 20 мая 2015 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 192479466.

**2. Заинтересованные лица Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является иностранное общество с ограниченной ответственностью «ПепсиКо Продактс», пер.1-й Загородный, д. 20, каб. 24, г. Минск, Республика Беларусь, 220073.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются совершеннолетние физические лица, проживающие или пребывающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры (далее – Участники), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, лица, находящиеся с ним в отношениях свойства, а также лица, занимающие в организации, являющейся заинтересованным лицом, руководящие должности.*

Члены комиссии по проведению Рекламной игры не могут быть участниками Рекламной игры.

* Для целей настоящих Правил под лицами, занимающими в организации, являющейся заинтересованным лицом, руководящие должности, понимаются лица, занимающие должность руководителя либо заместителя руководителя организации, иного работника, осуществляющего организационно-распорядительные (руководящие, организационные, направляющие, координирующие и контролирующие) функции применительно к организации, ее структурным подразделениям, работникам и направлениям деятельности.

**4. Наименование Рекламной игры**: «Пачка на прокачку».

**5. Территория проведения Рекламной игры**: Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры**: 01 августа 2024 г. Период, когда Участник должен приобрести продукт для участия в Рекламной игре: с 01 августа 2024 г. по 11 сентября 2024 г. включительно.

**7. Срок окончания Рекламной игры**: 16 ноября 2024 г. (включая период розыгрыша и выдачи призов).

**8. Наименования продуктов, в целях стимулирования продаж которых проводится Рекламная игра.**

Снеки торговых марок Lay's (кроме Lay's STAX), Cheetos и Хрусteam.

**9. Призовой фонд Рекламной игры**.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств заинтересованного лица (ИООО «ПепсиКо Продактс») в размере 281 154,98 (двести восемьдесят одна тысяча сто пятьдесят четыре) белорусских рубля 98 копеек. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

***Таблица № 1 – Призовой фонд:***

| № п/п | Наименования призов | Кол-во шт. | Стоимость за ед., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Электромобиль BYD Yuan Plus Flagship в комплектации в соответствии со спецификацией Емкость батареи (кВт/ч): 60,5 Цвет: Серый Куз. №: LC0CE4CB3P4210815 Год выпуска: 2023 Страна происхождения: Китай | 1 | 94 185,00 | 94 185,00 |
| | Денежные средства в размере | 1 | 14 042,54 | 14 042,54 |
| | (далее – «Суперприз») | | | |
| 2 | Велосипед Racer Matrix 27.5 18 серый бронзовый металлик 2024. Страна производства: Республика Беларусь | 6 | 954,00 | 5 724,00 |
| | Денежные средства в размере | 6 | 111,47 | 668,82 |
| | (далее – «Приз 1») | | | |
| 3 | Электросамокат MyWay X5 (графитовый) Страна производства: CN | 6 | 1 080,00 | 6 480,00 |
| | Денежные средства в размере | 6 | 130,30 | 781,80 |
| | (далее – «Приз 2») | | | |
| 4 | Рюкзак для ноутбука Thule Aion 28L, коричневый, 3204722, Вьетнам | 6 | 501,60 | 3 009,60 |
| | Денежные средства в размере | 6 | 43,87 | 263,22 |
| | (далее – «Приз 3») | | | |
| 5 | Набор из многоразовых бамбуковых трубочек д/питья со щеткой + нанесение логотипа, страна происх. – Китай | 20 000 | 7,80 | 156 000,00 |
| | (далее – «Приз 4») | | | |
| | **ИТОГО:** | | | **281 154,98** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в срок с 01.08.2024 г. по 11.09.2024 г. включительно:

10.1.1 Первыми принести не менее 10 (десяти) пустых пачек от игровых продуктов в любой из Центров выдачи призов, указанных в Таблице № 2 п.11.2, в часы их работы.

10.1.2 Выбрать (пока есть в наличии) из общего количества имеющихся у промоутера скретч-карт одну скретч-карту за каждые 10 (десять) пустых пачек от игровых продуктов. Количество скретч-карт ограничено тиражом 120 000 шт.

10.1.3 Аккуратно стереть защитное покрытие со стираемого поля (находится под надписью «КОД»). Стирание производить неострым предметом на ровной поверхности (поврежденные Участником скретч-карты с невозможностью идентифицировать уникальный буквенно-цифровой код участия в Рекламной игре не принимают).

10.1.4 В срок с 01.08.2024 г. по 11.09.2024 г. зарегистрироваться на интернет-сайте promo.repacklays.by.

Для регистрации на Интернет-сайте необходимо в разделе «Личный кабинет» ввести абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника, получить код для регистрации (посредством СМС), ввести его в поле регистрации, завершить регистрацию, нажав соответствующую кнопку.

10.1.5 В срок с 01.08.2024 г. по 11.09.2024 г. в личном кабинете на интернет-сайте достоверно заполнить Персональные данные, подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, дать согласие на обработку Персональных данных в целях проведения Рекламной игры.

10.1.6 В срок с 01.08.2024 г. по 11.09.2024 г. в личном кабинете на Интернет-сайте в поле «Введите код со скретч-карты» ввести уникальный буквенно-цифровой код, расположенный в стираемом поле на скретч-карте.

10.2. Игровые коды присваиваются Участнику после ввода уникального буквенно-цифрового кода и отображаются в личном кабинете на интернет-сайте в срок не менее чем за сутки до даты проведения розыгрыша призового фонда.

10.3. В розыгрыше призов участвуют игровые коды только тех Участников, которые выполнили условия п. п. 10.1. настоящих Правил.

10.4. Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т.д.). Каждому Участнику, который совершил действия, указанные в п. 10.1. настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного игровой код на дату и время регистрации уникального буквенно-цифрового кода в личном кабинете на интернет-сайте. В случае если у Участников совпадают дата и время регистрации уникального буквенно-цифрового кода, присвоение кодов совершается в алфавитном порядке по фамилии, собственному имени, отчеству (если таковое имеется).

10.5. Каждый Участник может принимать участие в розыгрышах призов неограниченное количество раз при выполнении условий п.10.1. настоящих Правил и выполнении требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

10.6. Участник получает одну скретч-карту за каждые 10 (десять) пустых пачек от игровых продуктов.

10.7. Количество скретч-карт для каждого ЦВП ограничено и указано в Таблице № 2.

10.8. В розыгрышах призов участвуют первые 120 000 человек, выполнившие все условия п. 10.1. и выполнившие требования, необходимых для участия в Рекламной игре.

**11. Порядок выдачи скретч-карт.**

11.1. Общий тираж скретч-карт – 120 000 штук.

11.2. Участнику, который совершил действия, указанные в п. 10.1.1 настоящих Правил, промоутер предлагает на выбор скретч-карту из стопки карт, имеющихся в наличии в ЦВП в данный момент.

***Таблица № 2 – адреса центров выдачи призов, режим работы и распределение скретч-карт:***

| № п/п | Адрес | Режим работы | Кол-во скретч-карт, шт. |
|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, пр-т Дзержинского, 90, магазин «АЛМИ» | 01, 02, 03, 04, 08, 09, 10, 11, 15, 16, 17, 18, 22, 23, 24, 25, 29, 30 и 31 августа 2024 г. 01, 05, 06, 07, 08, 09, 10 и 11 сентября 2024 г. с 16.00 до 20.00 | 5 000 |
| 2 | г. Минск, ул. Притыцкого, 93, магазин «АЛМИ» | | 5 000 |
| 3 | г. Минск, ул. Уборевича, 176, магазин «Green» | | 5 000 |
| 4 | г. Минск, пр-т Партизанский, 182, «Green» | | 5 000 |
| 5 | г. Минск, проспект Дзержинского, 126, магазин «ProStore» | | 5 000 |
| 6 | г. Минск, пр-т Победителей, 9, ТРЦ «Galleria Minsk» | | 5 000 |
| 7 | г. Минск, ул. Бобруйская, 6, ТЦ «Galileo» | | 5 000 |
| 8 | г. Минск, ул. Тимирязева, 74А, ТЦ «Palazzo» | | 5 000 |
| 9 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, 9 магазин «Семь пятниц» | | 5 000 |
| 10 | г. Минск, Свердлова, 11, ТЦ «Центрополь» | | 5 000 |
| 11 | г. Брест, ул. Гаврилова, 16, ТЦ «Экватор» | | 7 000 |
| 12 | г. Брест, ул. Рябиновая, 1А, магазин «Санта» | | 7 000 |
| 13 | г. Гродно, Тимирязева, 8, магазин «ЕВРООПТ» | | 7 000 |
| 14 | г. Гродно, проспект Янки Купалы, 87, ТРЦ «Trinity» | | 7 000 |
| 15 | г. Витебск, пр-т Строителей, 15В/Г, ТЦ «Трио» | | 7 000 |
| 16 | г. Витебск, пр-т Московский, 86, пом. 2, магазин «Санта» | | 7 000 |
| 17 | г. Гомель, Речицкий проспект, 5В, ТЦ «Мандарин Плаза» | | 7 000 |
| 18 | г. Гомель, Победы, 11, магазин «СОСЕДИ» | | 7 000 |
| 19 | г. Могилев, ул. Белинского, 28, ТЦ «Гринвич» | | 7 000 |
| 20 | г. Могилев, ул. Николая Островского, 5, ТЦ «Планета грин» | | 7 000 |
| | Общее количество, шт. | | 120 000 |

Выдача скретч-карт производятся при их наличии в Центрах выдачи призов, перечисленных в Таблице № 2. Распределение скретч-карт указано в Таблице № 2.

В случае если в одном из ЦВП скретч-карты отсутствуют в связи с их полным расходом, участники могут получить скретч-карту в любом другом ЦВП при их наличии.

**12. Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, в т. ч. порядок определения выигравших Участников Рекламной игры.**

